НЯДЗЕЛЯ 12 ЛІСТАПАДА 1933 г. № 261.

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Волі, Палац працы, 3-ці паверх
ПАДПІСНАЯ ЦЕНА 2 р. у мес
Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-73; нач. рэдактара, партыйны і масавы сектары 4-76; сектары: прамысловы, сельска гаспадарчы—72; рабоч. снабжэння і калгасарады, сан. будаўніцтва нац. культурнага будаўніцтва 4-15, аддзеў рабочых і калгаснікаў, бюро расследаванняў — 2-00, кантора—55; начная рэдакцыя—4-54.

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б, ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

СЕННЯ У НУМАРЫ

Сёння—XVI годдзе рабоча сялянскай міліцыі.
18 лістапада праводзіцца агульнараённы суботнік моладзі на карысць абароны СССР.

ЗА ГРАНІЦАЙ: Допыт міністра прапаганды прускага ўрада Гебельса на працэсе аб падпале рэйхстага.

18—19 лістапада—агульнараенны суботнік моладзі на карысць жалезнага фонда абароны СССР.

Разгорнем масавую падрыхтоучую работу да маладзежнага суботніка, уцягнем у яго шырокія масы дарослых рабочых і калгаснікаў, разгорнем соцспаборніцтва паміж калектывамі і ячэйкамі на лепшую падрыхтоуку і правядзенне суботніка.

НА СУБОТНІК!

Дзень XV гадовага юбілея комсамола з'явіўся небачанай дэманстрацыяй любві і пашаны, якімі акружаюць ленінскі комсамол усе працоўныя і ўсе перадавыя людзі не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Вялікую любоў і высокую ацэнку атрымаў комсамол у прывітаннях ад правадыра сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІНА кіраўнікоў партыі і нашай совецкай гаспадаркі. Натуццём глыбейшай пашаны прасякнуты прывітальныя прамовы з боку самых шматлікіх дэлегацый, арганізацый і сходаў, адзначаўшых гэту вялікую дату ў жыцці працоўнай моладзі Совецкага саюза.

Юбілейныя дні—ёсць дні найвялікшага гонара для кожнага комсамольца, для кожнага маладога рабочага і сялянина. Урад Совецкага саюза ўзнагародзіў лепшых кіраўнікоў ленінскага комсамола і комсамольскіх работнікаў, перадавых ударнікаў і ўдарніц вышэйшай рэволюцыйнай узнагародай—ордэнам ЛЕНІНА. Урадам тым самым яшчэ раз глыбока падкрэслілі усю тую любоў, якою пра сякнута наша краіна да дзецішча партыі—Левінскага комсамола і дала гэтым актам вышэйшую ацэнку работы нашай пяцімільённай арганізацыі і яе кіраўнікоў.

Святкаванне XV-годдзя комсамола павінна ўліць ва ўсе атрады нашага саюза яшчэ больш творчых сіл, творчай энергіі. XV годдзе УсеЛКСМ павінна яшчэ дзясней згуртаваць увесь ленінскі комсамол, усё маладое пакаленне працоўных Совецкага саюза вакол партыі Леніна, яе баявога кіраўніцтва ў творах Цэнтральнага камітэта і правадыра сусветнага пролетарыята—тав. СТАЛІНА.

Ніколі нельга запамятаць, і падрастаючыя пакаленні ніколі гэтага не запамятаюць, што толькі дзякуючы намаганням большэвіцкай партыі і яе правадыроў—тт. ЛЕНІНА і СТАЛІНА, што толькі дзякуючы пусканню кіраўніцтву комуністычнай партыі з невялікага атрада ў некалькі тысяч чалавек магло вырасці магутнае, усімі любімае і ўважаемае комсамольскае племя. Нельга не падкрэсліць, што найвялікшага гонара ўдастойваецца кожны, хто носіць высокае званне члена Ўсесаюзнага Ленінскага Комуністычнага саюза моладзі.

Сёння мы публікуем пастанову Цэнтральнага камітэта комсамола, ўхваленую сакратарыятам ЦК УсеКП(б) аб правядзенні ўсесаюзнага суботніка моладзі і ў прамысловасці, транспарце, комунальнай і сельскай гаспадарцы. Правядзенне ўсесаюзнага суботніка, сродкі ад якога павінны паступіць у жалезны фонд абароны Совецкага саюза, з'яўляецца найвялікшай справай, якою комсамол адзначыць свой XV гадовы юбілей. Мы ведаем, якое агромаднае ісцінна-гістарычнае значэнне прыдаваў Уладзімір Ільіч Ленін комуністычным суботнікам. Ён казаў, што „комуністычныя суботнікі менавіта таму маюць агромаднае гістарычнае значэнне, што яны паказваюць нам сваёмы, добраахвотны пачын рабочых у развіцці прадукцыйнасці працы, у пераходзе да новай працоўнай дысцыпліны, у стварэнні соцыялістычных умоў гаспадаркі і жыцця".

Ленінскі комсамол, які носіць вялікае імя Леніна, ідучы ва ўсім па яго бессмертных указаннях, і на гэты раз павінен прыкладзі ўсе сілы, усё ўменне, усе арганізаторскія здольнасці да таго, каб з максімальнымі рэзультатамі правесці ўсесаюзны суботнік. Аб'екты работы гэтага суботніка цвёрда ўстаноўлены пастановай Цэнтральнага камітэта УсеЛКСМ. Кожны камітэт і кожная ячэйка павінны безадкладна прыступіць да распрацоўкі самага дакладнага аперацыйнага плана правядзення гэтага суботніка. Комсамольцы, маладыя рабочыя і калгаснікі павінны як адзін выйсці на суботнік. Выкананне гэтай ўмовы ва многім будзе залежаць ад арганізацыі затарскіх здольнасцяй, ад глыбокага прадуманай масава-растлумачальнай работы, якую павінны правесці на шы камітэты і іх кіраўнікі, каб аховіць суботнікам усіх комсамольцаў, усю моладзь,—а пастанова ЦК УсеЛКСМ указвае, што на гэты суботнік жадана прыцягненне і дарослых рабочых, калгаснікаў,—для гэтага трэба падыйсці да яго арганізацыі сур'ёзна, адпаведным чынам падрыхтаваўшыся, распланаваўшы сілы, строга намецёўшы ўсе ўчасткі работы. Ні для каго не сакрэт, што пры правядзенні нашых суботнікаў нерэдка панае бестаўшчына: людзі прыходзяць на работу са спазненнем, незарганізавана, не хапае інструмента і адпаведных прыстасаванняў. Каб уніхнуць гэткай незарганізаванасці, трэба на кожны з участкаў паставіць не балбатуноў, а сапраўдных арганізатараў, кіраўнікоў. Калі ўжо ўзяла ся ячэйка ачысціць завадскі двор ад бруда, то трэба прадугледзець, каб гэты ўчастак работы быў забяспечан адпаведнай колькасцю рабочай сілы, каб кожная група мела вызначанага кіраўніка і загадзя ведала месца і варэння работы. Усе ўдзельнікі суботніка павінны быць забяспечаны інструментам, з'явіцца ў адпаведным рабочым адзенні. Необходна праду гледзець забяспячэнне транспартам і загадзя вызначыць, куды трэба вывозіць бруд і ўсякія адкіды завадскага двара. Усё да мяльчэйшых падрабязнасцяй трэба па гаспадарску прадугледзець, а галоўнае—прыняць адпаведныя меры да таго, каб кожны работаючы не толькі з'явіўся на суботнік, але і прарабатаў на ім поўны рабочы дзень, гэта значыць 420 мінут. Не трэба думаць, што толькі правядзенне суботніка ў прадпрыемстве ці на транспарце патрабуе адпаведнай падрыхтоўкі. Правядзенне іншэрната ў парадак, здавалася б дробязь. Але і гэта работа патрабуе адпаведна падрыхтоўчых мерапрыемстваў. Трэба забяспечыць дастатковую колькасць матэрыялаў: вёдры, трапкі, нагрэць вады і дабіцца таго, каб кожная работа дала адпаведны эфект.

Комсамольскія камітэты абавязаны паклапаціцца аб тым, каб значныя пчасты моладзі, асабліва з устаноў, КНУ, тэхнікумаў, пярэдавармейскіх часцей, паміма работы па культурным добрабыце сваіх устаноў, інтэрнатаў, школ і г. д. павінны быць выкарыстаны на агульна-карысной рабоце на прадпрыемствах, транспарце, гародніна хавальнях і на другіх участках.

Правядзеннем усесаюзнага суботніка комсамол трымае найвялікшы экзамен перад усёй краінай, экзамен на арганізаванасць, уменне гаспадарнічаць і праводзіць адпаведную падрыхтоўчую масавую работу. Ніякай мітусні, ніякай паспешнасці, ніякай нераспаражданасці не павінна быць праяўлена ў правядзенні гэтага суботніка. Кожны павінен памятаць, што саюз будзе ацэньваць работу па колькасці з'явіўшыхся на суботнік, па арганізаванасці правядзення суботніка і яго канкрэтных выніках.

Комсамол у працэсе правядзення свайго юбілея ўзяў яшчэ больш высокія баявыя тэмпы работы. Не знижаць тэмпаў, дабіцца ператварэння ўсяго комсамола ў адзіную ўдарную брыгаду, апраўдаць надзею т. Сталіна на тое, што «ударнікі комсамола праявяць яшчэ больш адвагі і пачын у справе асваення новай тэхнікі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, у справе ўзмацнення абароназдольнасці нашай краіны, у справе ўмацавання нашай арміі, нашага флота, нашай авіяцыі»,—такава задача. (Перадавы артыкул «Комсомольской правды»).

АБ ПРАВЯДЗЕННІ ЎСЕСАЮЗНАГА СУБОТНІКА МОЛАДЗІ

ў прамысловасці, транспарце, комунальнай і сельскай гаспадарцы (у совгасах, МТС і калгасах).

ПАСТАНОВА ЦК УсеЛКСМ.

(Адобрана сакратарыятам ЦК УсеКП(б) ад 28-X-33 г.).

1. У адзнаку 15-годдзя Ўсесаюзнага Ленінскага комуністычнага Саюза Моладзі правесці ўсесаюзны суботнік моладзі, сродкі ад якога павінны паступіць у жалезны фонд абароны СССР.

2. Усесаюзны суботнік моладзі правесці 12 лістапада г. г., а ў тых прадпрыемствах і ўстановах, якія не могуць па вытворчых прычынах арганізаваць ва ўстаноўлены тэрмін, суботнік праводзіцца ў адзін з наступных дзён, але не пазней 24 лістапада.

3. Асноўнымі аб'ектамі работы суботніка ўстанавіць:

а) работа на прадпрыемствах за варштатам ва ўсіх галінах вытворчасці па выпуску прамысловай прадукцыі, рамонт заводскага транспарта і пад'ездных шляхоў, ачыстка і навядзенне ўзорнай чыстаты ў майстэрнях, цэхах, фабрычна-заводскіх дварах, збор металічнага лома. Пагрузка гатовай прадукцыі і разгрузка паступаючай сыравіны. Рамонт чыгуначных шляхоў, пагрузка і разгрузка апала, метала, збожжа, леса, гародніны і іншых грузаў;

б) рамонт жылых дамоў і ацяпленне баракаў. Рамонт, уборка і навядзенне чыстаты ў больніцах, пральнях, сталовых, магазінах, клубах, школах, праводка вадаправода. Падвозка і разгрузка топліва для насельніцтва, падвозка і пераробка гародніны ў гароднехавальніках;

в) у совгасах, МТС і калгасах—выкананне асенніх сельска-гаспадарчых работ, рамонт шляхоў, мастоў, школ, больніц, клубаў, ясляў і навядзенне чыстаты ў іх. Падрыхтоўка да зімы скотных двароў, падрыхтоўка павеценняў і арганізацыя ўзорнага парадка-хавання сельска-гаспадарчых машын і інвентара.

4. Кожны камітэт і ячэйкі УсеЛКСМ павінны шырока разгарнуць масавую работу па падрыхтоўцы да ўсесаюзнага суботніка моладзі, дабіваючыся, каб усесаюзны суботнік моладзі быў сапраўды масавым мерапрыемствам не толькі комсамольцаў, але і ўсёй моладзі. Пажадана прыцягнуць дарослых рабочых і калгаснікаў.

Кожны камітэт і ячэйка УсеЛКСМ сумесна з гаспадарнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў (дырэктарамі, начальнікамі цэхаў, майстэрань, старшынямі праўленняў калгасаў, заг. клубамі, культурна-бытавымі ўстановамі, заг раймукомунаддзеламі і г. д.) павінны раней падрыхтавацца да арганізаванага правядзення суботніка і забяспечыць поўнае і правільнае выкарыстанне людзей (раней вызначыць аб'екты работы, вылучыць арганізатараў—брыгадзіраў, пазнаёміць іх з умовамі і аб'ектамі работы, вылучыць адказных прадстаўнікоў адміністрацыі, забяспечыць неабходным інструментам), заключыўшы спачатку дагаворы з гаспадарнікамі аб аплаце за суботнік.

5. Лічыць магчымым прыцягненне да ўдзелу ў суботніку моладзі, піянераў і школьнікаў старэйшых узростаў пры ўмове выкарыстання іх на пасільнай рабоце, у першую чаргу—работа ў школах, клубах, хатах-чытальнях, адводзячы піянерам і школьнікам спецыяльныя аб'екты работы, стваравочы з іх асобныя брыгады, забяспечыўшы іх вопытным кіраўніцтвам дарослых брыгадзіраў.

6. Сродкі ад усесаюзнага суботніка моладзі павінны неадкладна з прадпрыемстваў, устаноў і г. д. пераводзіцца на бягучы рахунак № 92—89 Маскоўскай абласной канторы Дзяржбанка для ЦК УсеЛКСМ.

Забараніць усім мясцовым арганізацыям утрымліваць якія-небудзь процанты на мясцовыя выдаткі з сум, выручаных ад суботніка.

Абавязаць першых сакратароў абкомаў, крайкомаў і ЦК КСМ нацрэспублік устанавіць кантроль за сваечасовым унясеннем усіх сродкаў ад суботніка ў жалезны фонд абароны краіны.

АБ ПРАВЯДЗЕННІ УСЕСАЮЗНАГА СУБОТНІКА, АБВЕШЧАНАГА ЦК УсеЛКСМ.

Пастанова бюро гаркома ЛКСМБ.

1. Для папулярызацыі мет Усесаюзнага суботніка прапанаваць сакратарам калектываў і ячэек в 8 па 15 лістапада правесці сходы комсамольцаў і рабоча калгаснай моладзі па прапрацоўцы пастановы ЦК УсеЛКСМ, а таксама разгарнуць масава-растлумачальную работу сярод дарослых рабочых і калгаснікаў з мэтай прыцягнення іх да ўдзела ў суботніку, для чаго размеркаваць комсамольскі актыў па групах, брыгадах, арганізаваць сістэматычнае асвятленне падрыхтоўкі да суботніка ў заводскіх шматтыражках, арганізаваць назочную агітацыю (лозунгі, плакаты і г. д).

2. Абавязаць усіх сакратароў калектываў і ячэек распрацаваць канкрэтны план падрыхтоўкі і правядзення суботніка, давесці гэты план да кожнага комсамольца, рабочай і калгаснай моладзі, дарослых рабочых і калгаснікаў.

3. Па горадзе суботнік правесці 18, а па вёсцы—19 лістапада 1933 г. (прадпрыемствы, у якіх дзень адпачынку не супадае з днём суботніка, праводзяць суботнік у бліжэйшы дзень адпачынка свайго прадпрыемства).

4. Для кіраўніцтва, падрыхтоўкі і правядзення суботніка вылучыць пяцёрку ў складзе тт. РАГОЖКІНА, прадстаўніка гарпрафсовета, палітаддзела МСТ, палітаддзела чыгункі і палітаддзела Н скай дывізіі, якой даручыць у двухдзённы тэрмін вызначыць аб'екты работы для комсамольцаў, моладзі навучальных устаноў, совецкіх і кааперацыйных устаноў, а таксама скласці канкрэтны план правядзення суботніка.

5. Прапанаваць сакратарам калектываў і ячэек прыцягнуць да ўдзела ў суботніку комсамольцаў і піянераў старэйшага ўзросту прымацаваных школ, намеціць для іх канкрэтныя аб'екты работы і разам з гарбюро ДКА правесці ў школах адпаведную растлумачальную работу сярод комсамольцаў, піянераў і вучняў.

6. Арганізаваць соцспаборніцтва паміж калектывамі і ячэйкамі на большэвіцкае правядзенне суботніка і перавод грошай да 20 лістапада, для чаго ўстанавіць премію:

а) лепшаму калектыву і ячэйцы—грамату гаркома ЛКСМБ;

б) дзве премії для сакратароў калектываў і ячэек;

в) дзесяць інтэрвідуальных премій для лепшых ударнікаў-комсамольцаў і рабоча калгаснай моладзі, дарослых рабочых і калгаснікаў, паказаўшых узоры большэвіцкай работы па падрыхтоўцы і правядзенні суботніка.

Прэміяванне правесці на пленуме ГК.

7. 11 лістапада правесці нараду гарактыва горада па гэтым пытанні.

8. Даручыць т. Галакціонаву 12 лістапада навіраваць з гарадскога комсамольскага актыва 15 чалавек для дапамогі калгасным ячэйкам у падрыхтоўцы і правядзенні суботніка.

9. Прасіць палітаддзел Н скай дывізіі абмеркаваць пытанне аб удзеле ў суботніку комсамольцаў вайсковых часцей.

10. Прасіць рэдакцыю „Віцебскага пролетарыя" сістэматычна асвятляць ход падрыхтоўкі і правядзення суботніка на старонках газеты.

РУЙНУЮЧЫ УДАР—ПА ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫХ НАСТРОЯХ, ПА АПАРТУНІСТЫЧНЫХ СПАСЫЛАННЯХ НА НЕМАГЧЫМАСЦЬ ЗАРАЗ УЗНІМАЦЬ ЗЯБЛІВА.

ВЫКАНАЦЬ ПЛАН ЗЯБЛІВА ПОЎНАСЦЮ.

План зяблівага ворыва па нашым раёне на 5 лістапада выканан толькі НА 69,6 проц

Калі такія сельсоветы, як ШУМНЯНСКІ і МІХАЛЁЎСКІ, з гонарам справіліся з гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай баявой падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і гэтым самым закладзілі моцны фундамент для павышэння ураджайнасці будучага года, то астатнія сельсоветы плана зяблівa не выканалі а такія сельсоветы, як РУДНІЦКІ (38,5 проц. выканання плана), НІКАЛАЁЎСКІ (33,7 проц), ДАЎЖАНСКІ (40,9 проц), СЕЛЮЦКІ (56,2 проц), БАРАЎЛЯНСКІ (59,4 проц) злачынна зрываюць ворыва.

На першым этапе барацьбы за зяблева БАРАЎЛЯНСКІ сельсовет (старшыня КУРАКОЎ) ішоў параўнаўча з іншымі сельсоветамі лепш, а зараз апынуўся у хвасце ганебна адстаючых.

Працягвае зрываць зяблевае ворыва і ДАЎЖАНСКІ сельсовет (старшыня ПІСКУНОЎ). Гэтая справа пушчана там на паўнейшы самацёк.

Наступіўшыя першыя замарозкі і незначнае выпадзенне першага снега не можа быць першкодай для завяршэння зяблева. А між тым сігналы з месц гаворыць, што першыя замарозкі «спужалі» кіраўнікоў рада калгасаў НІКАЛАЁЎСКАГА, ДАЎЖАНСКАГА, РУДНІЦКАГА сельсоветаў.

УСЯКІМ НАСТРОЯМ АБ ТЫМ, ШТО ЗАРАЗ УЖО БОЛЬШ НЕЛЬГА ЎЗНІМАЦЬ ПАД ЗЯБЛІВА, ТРЭБА ДАЦЬ БЕЗЛІТАСНЫ АДПОР.

Такія настроі выходзяць выключна ад кулацка шкодніцкіх элементаў, якія імкнуцца гэтым самым сарваць выкананне планаў веснавой сяўбы другога года другой пяцігодкі.

Трэба яшчэ раз напомніць усім сельсоветам і калгасам, асабліва Даўжанскага, Нікалаёўскага, Рудніцкага сельсоветаў аб уроках веснавой сяўбы гэтага года. Ні для каго не будзе секрэтам, што імкненне зрыву зяблева ў мінулым годзе пацягнуў за сабой і зрыў веснавой сяўбы.

Першачарговая, самая баявая і ўдарная задача кожнага сельсовета, кожнага калгаса заключаецца ў тым, каб рашуча пакончыўшы з апартуністычнымі настроямі, якія дзе нідзе праяўляюцца аб немагчымасці зараз арапь пад зяблева, — моцна ўзяцца за тое, каб кожны калгас, кожная калгасная брыгада, кожная адпаведная гаспадарка далкам і поўнасцю ў самыя бліжэйшыя дні высокаякасна завяршылі зяблевае ворыва.

18.802 ГА ЗЯБЛІВА І НІВОДНАГА ГА НЕ МЕНШ—БАЯВАЯ ПРАГРАМА БАРАЦЬБЫ ЗА ПАСПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕННЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ БУДУЧАГА ГОДА.

Трактарам—поўную нагрузку.

Трактарысты ШЫЛАЎ І МАРОЗАЎ у калгасе «Асінаўка», Бараўлянскага сельсовета працуюць на зяблеве ў сярэднім толькі па 9 гадзін у дзень, а астатні час скарыстоўваюць трактар на розныя перавозкі. 30 кастрычніка яны на зяблеве прапавялі толькі 6 гадзін.

Неабходна МТС наладзіць бесперапынную работу трактара на зяблевым ворыве тым больш, што Бараўлянскі вытворчы ўчастак ганебна плянецца ў хвасце адстаючых.

Я КРЫЦКІ.

Цэнтральны камітэт УсеКП(б)—тт. СТАЛІНУ і КАГАНОВІЧУ, старшыні ЦВК СССР—т. КАЛІНІНУ, старшыні СНК СССР—т. МОЛАТАВУ, Наркамлёгпрам СССР—т. ЛЮБІМАВУ, ЦО партыі „Правда".

XVI гадавіну вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі рабочыя і калгаснікі Беларусі сустракаюць буйнейшай перамогай. 5-га лістапада ў 23 гадзіны, у тэрмін, устаноўлены ўрадам гомельскі шкляны завод даў выдачу шкла.

Уступіў у эксплуатацыю самы буйны і найбольш механізаваны ў Саюзе шклазавод па выробу высокаякаснага бемскага шкла. Завод абсталёван палкам совецкімі машынамі. Галавая магутнасць завода складае 30.000 тон шкла, або каля 20 проц. усёй колькасці бемскага і напоўсялага шкла, выпушчанага ў мінулым годзе ўсімі шкловаводамі Саюза. Будаваўся завод тры гады. За гэты час на будаўніцтве выраслі дзесяткі і сотні лепшых ударнікаў, герояў сацыялістычнага будаўніцтва, пачаўшых сваю работу чорнарабочымі і да пуска стаўшых камандзірамі шкляной прамысловасці. Пуск гомельскага шкляного завода з'яўляецца буйным укладам у справу соцыялістычнай індустрыялізацыі Саюза, перамогай генеральнай лініі партыі. Пуск гомельскага завода, які з'яўляецца самым буйным у Беларусі прадпрыемствам, ёсць свята ўсіх працоўных Беларусі, наглядны доказ правільнага правядзення партыяй пад кіраўніцтвам тав. Сталіна ленінскай нацыянальнай палітыкі. Соцыялістычная Совецкая Беларусь пры велізарнай брацкай дапамозе пролетарыята Совецкага Саюза становіцца краінай буйных індустрыяльных прадпрыемстваў, узброеных самай перадавой тэхнікай. Атрымана, на асаове генеральнай лініі нашай партыі, яшчэ адна бліскучая перамога. Пераключаем усе сілы і сродкі на лепшае правядзенне пускавога перыяда, на хутчэйшае асваенне праектнай магутнасці завода, на будаўніцтва другой чаргі завода.

Нахай жыве ленінская комуністычная партыя—кіраўнік і арганізатар соцыялістычных перамог!

Нахай жыве наш улюбёны настаўнік і правадыр партыі і пролетарыята ўсяго света тав. Сталін!

Нахай жыве Соцыялістычная Совецкая Беларусь!

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК Беларусі ГАЛАДЗЕД.
Старшыня ЦВК БССР ЧАРВЯКОЎ.
Нам. Наркамлёгпрама СССР ЛЕВІН.

Сакратар гомельскага гаркома КП(б)Б ШАФАРЭНКА.

СЕННЯ—XVI-ГОДДЗЕ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МІЛІЦЫІ.

СЛАЎНАЯ ГАДАВІНА.

Шлях, пройдзены за мінуўшыя 16 год рабоча-сялянскай міліцыяй—шлях, поўны гераічнай, самаадданай барацьбы на шэрагу адказнейшых участкаў барацьбы за соцыялізм. Міліцыяй была праведзена велізарная работа па барацьбе з бандытызмам, за ўстанаўленне рэволюцыйнага парадку.

Органамі міліцыі праводзіцца вялікая праца па барацьбе са спадчынай царызму—вараўствам, прастытуцыяй, хуліганствам, п'янствам і г. д.

Немалая праца праведзена міліцыяй у справе барацьбы за паляпшэнне добрабыту горада і раёна, са стыхійнымі бедствіямі, пажарамі, паводкамі і г. д.

Аднак, адзначаючы 16-ую гадавіну, падкрэсліваючы значныя і бясспрэчныя дасягненні, ні ў якім разе нельга захаваць цэлы шэраг яшчэ маючыхся буйных недахопаў у рабоце міліцыі.

Далёка недастаткова яшчэ штодзённая сувязь з шырокімі працоўнымі масамі горада і вёскі.

Існуючыя брыгады садзейнічання міліцыі на шэрагу прадпрыемстваў зруйнаваны дрэнна працуюць. Даклады аб рабоце міліцыі надзвычайна рэдка ставяць на рабочых сходах. Гэтыя недахопы патрэбна ўлічыць і выправіць.

Далёка незадавальняюча пастаўлена праца да гэтага часу па санітарнай ачыстцы гораду і па ахове зялёных насаджэнняў. Толькі за апошні час ёсць першы пачатак некаторага пералома у справе прывядзення у парадак санітарнага становішча горада.

Не гледзячы на значнае паменшэнне краж, яны аднак, яшчэ не знішчаны канчаткова. Бліжэйшай задачай міліцыі з'яўляецца дабіцца поўнай ліквідацыі гэтай праклятай спадчыны царызма.

Перад Гарсоветам і міліцыяй стаіць сур'ёзнае пытанне аб арганізацыі калоніі непоўнагодніх злачынцаў, а «Таварыства прыхільнікі Дзяцей» і органы Нарасветы разам з міліцыяй павінны звярнуць больш увагі на справу іх выхавання.

Неабходна знішчыць буйнейшыя недахопы ў справе забеспячэння матэрыяльна-бытавых умоў работнікаў міліцыі (жыллё, сталовыя, паляпшэнне працы прыгараднай гаспадаркі і г. д.).

Міліцыя павінна ўзмацніць працу па праверцы сваіх шэрагаў з тым, каб ні адзін чужы элемент не знаходзіў тут прытулку.

Святкаванне гадавіны павінна быць выкарыстана для яшчэ большага ўзмацнення марксісцка-ленінскага выхавання, для падняцця рэволюцыйнай пільнасці і ажыццяўлення рэволюцыйнай законнасці, для узмацнення выхаваўчай работы і падняцця культурнасці ўсіх міліцэйскіх работнікаў і гэтым самым яшчэ большага ўзмацнення боездольнасці шэрагаў міліцыі. Для гэтага неабходна яшчэ шырэй разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Знішчаючы маючыяся недахопы, рэалізуючы на справе прапановы пленарнай камісіі па чыстцы партарганізацыі міліцыі, шырока разгортваючы пролетарскую крытыку і самакрытыку сустрэнем 17 гадавіну РСМ новымі дасягненнямі ў рэалізацыі баявых задач пастаўленых партыяй і ўрадам перад Рабоча-Селянскай міліцыяй.

Начальнік Палітінспекцыі Віцебскага аперэтыўнага сектара міліцыі ХОНІК.

ПРЫВІТАННІ ДА XVI-ГОДДЗЯ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МІЛІЦЫІ.

Байцам, камандзіру і палітычнаму складу рабочай сялянскай міліцыі Віцебскага гарнізона цёплае чэкісцкае прывітанне ў дзень сваёй XVI й гадавіны.

Таварышы! Шаснаццаць год прайшло з таго дня, калі ў Кастрычніку 1917 года пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў на чале з ЛЕНІНЫМ і СТАЛІНЫМ пролетарыят сумесна з бяднейшым сялянствам скінуў ярмо капіталістычнага рабства і ўзяў уладу, каб будуецца бясклассавае соцыялістычнае грамадства. Кастрычнік стаў сцягам барацьбы і перамог эксплоатуемых і прыгнечаных усяго света.

Байцы рабочая сялянскай міліцыі, вы стаіце на варце аховы соцыялістычнай маёмасці і мы спадзяемся, што вы з гонарам будзеце і ў далейшым выконваць тыя задачы, якія пастаўлены перад вамі комуністычнай партыяй і рабочым класам.

Вы павінны быць у першых шэрэнгах барацьбітоў за соцыялізм.

Яшчэ вышэй сцяг ЛЕНІНА і СТАЛІНА! Будзьце гатовы да далейшых баёў за справу Леніна!

Нахай жыве Кастрычніцкая рэволюцыя!

Нахай жыве наш градушчы сусветны Кастрычнік.

КАЛЕКТЫЎ ПРАЦАЎНІКОЎ ВІЦЕБСКАГА АПЕРСЕКТАРА АДПУ.

* * *

Прафсаюзы Віцебшчыны шлюць сваё гарачае прывітанне аднаму з баявых органаў дыктатуры пролетарыята—рабоча-сялянскай міліцыі у дзень святкавання сваёй 16 гадавіны.

Віцебская міліцыя, як частка ўзброенага органа дыктатуры пролетарыята на працягу 16 год пільна ахоўвала і ахоўвае рэволюцыйны парадак і соцыялістычную маёмасць, саўсёды з'яўлялася і з'яўляецца верным органам партыі і ўрада ў барацьбе за ўмацаванне дыктатуры пролетарыята, аховы рэволюцыйнай законнасці, за пабудову бесклассавага соцыялістычнага грамадства.

Таварышы байцы, камандзіры і палітработнікі Віцебскага гарнізона працуючыя на адным з адказнейшых участкаў соцыялістычнага будаўніцтва—павінны горка ахоўваць соцыялістычную маёмасць і цвёрда памятаць, што соцыялістычная маёмасць—свяшчэнна і недатыкальна.

Гарпрафсовет упэўнен, што Віцебская міліцыя і надалей пільна будзе стаяць на варце завадаў Кастрычніка, яшчэ больш узмоцніць сваю баздольнасць.

Нахай жыве 16 гадавіна рабоча-сялянскай міліцыі.

ГАРПРАФСОВЕТ.

* * *

Па-большэвіцку змагайцеся за марксісцка-ленінскую вучобу, за асваенне ваеннай тэхнікі, на справе пакажыце сваю авангардную ролю ў органах рабоча сялянскай міліцыі.

Гарком КСМ і надалей будзе аказваць рабоча-сялянскай міліцыі ў яе адказнейшай рабоце штодзённую практычную дапамогу.

НЯХАЙ ЖЫВЕ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МІЛІЦЫЯ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ УсеКП(б)—КІРАЎНІК СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА!

Пытанні жывелагадоулі— у цэнтр увагі.

30 і 31 кастрычніка ў Палацы працы на нарадзе работнікаў соцыялістычнай жывёлагадоўлі раёна прысутнічала 88 чалавек—загадчыкаў МТФ, конюхаў, даярак, 9 свінароў і інш.

У работах нарады прынялі ўдзел сакратар гаркома КП(б)Б т. ЖУРАЎЛЁЎ, старшыня гарсовета т. БАСКІН, старшыня гарКК—РСІ т. АВЕРЫН і начальнік палітаддзела Віцебскай МТС т. Волкаў.

За самую завостраную рэволюцыйную пільнасць на ўчастку барацьбы за жывёлагадоўлю!

З дакладам аб становішчы жывёлагадоўлі па раёну выступіў загадчык гарза т. Жук, які адзначыў, што задачы высунутыя партыйнай канферэнцыяй па пытанні развіцця соцыялістычнай жывёлагадоўлі па нашаму раёну дагэтуль не выкананы. Асабліва дрэннае становішча з конскім пагалоўем. Каню, які адыгрывае велізарнейшую ролю ў нашай сельскай гаспадарцы, як рашаючая цяглавая сіла, і ў Чырвонай арміі па абароназдольнасці краіны, не ўдзяляецца належнай увагі. Да каня ў радзе калгасаў адносяцца шкодніцкі. Пагалоўе рабочых коняй зменшылася на 800 галоў. План укамплектавання буйнай рагатай жывёлай выканан толькі на 84 проц. У многіх калгасах прадукцыйныя каровы дрэнна ўтрымоўваюцца, разбазарваюцца і самае горшае становішча—гэта са свінным стадам. Стала ў некаторых калгасах злачынна знішчаецца. Усё гэта—вынік адсутнасці завостранай класавай пільнасці, вынік гвіла-ліберальных адносін да падрыўнай работы класавага ворага.

Так у калгасе імя Калініна, Сялюцкага сельсовета, у страўніку прырэзанай кароны былі знойдзены вострыя цвікі. У калгасе імя Чарвякова, Віцебскага сельсовета, у вясну прырэзана 11 кароў і ў чатырох з іх былі выяўлены праколы цвікамі. У калгасе „Звязда", Сялюцкага сельсовета, на працягу двух месяцаў сакавік—красавік прырэзана 20 кароў. Пры ўскрыцці іх таксама былі знойдзены цвікі, сапожныя шпількі і інш. У калгасе „Капачова" па гэтай-жа прычыне прырэзана 15 кароў. Мы не падрыхтавалі жывёлу да зімоўкі і не ўлічылі ўсіх горкіх урокаў мінулага года.

Кармы да гэтага часа загадчыкамі ферм яшчэ не прыняты. Панае абазлічка. Усё гэта з асабліваю сілаю падкрэслівае баявую задачу—карэнным чынам перабудаваць работу, мабілізаваць калгасныя масы, навуковыя сілы на належную пастаноўку справы соцыялістычнай жывёлагадоўлі, на бязлітасную барацьбу з класава-варожымі элементамі, на барацьбу за поўнае ажыццяўленне рашэння партыі і ўрада аб развіцці соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Аднак, у сваім выступленні дакладчык тав. Жук зусім мала падвергнуў крытыцы нікудышную работу былога кіраўніцтва гарза і нічога не сказаў аб зусім відавочным і бясспрэчным факце, што і сучаснае кіраўніцтва гарза дрэнна кіруе на мясцох справай жывёлагадоўлі, яшчэ не забяспечыла, рашаючага крутога пералому на гэтым адным з важнейшых і адказнейшых участкаў.

* * *

Большасць выступіўших з месц загадчыкаў МТФ—калгасаў „Пролетарская перамога", Бабініцкага сельсовета т (АНТАНЕНКА), „Шлях да соцыялізма, „Прагрэс", Бабініцкага сельсовета (т. ІВАНОЎ) «Звязда», Сялюцкага сельсовета, (т. ПАЎЛАВА), «Шлях Ільіча», (т. КОСАРАЎ), «Свабода», Старасельскага сельсовета, (т. МАЛКІНСКІ) і інш. гаварылі аб тым, што яны не падрыхтавалі жывёлу на зімоўку, што планы малака не выкананы, што малако разбазарваецца, скардзіліся, што з боку значнай часткі праўленняў калгасаў няма патрэбнай кожнадзённай увагі да МТФ, да жывёлы.

Крытыка без прозвішчаў, без выяўлення канкрэтных носьбітаў зла.

Выступіўшыя АГРАНОМ ШАБАШОЎ, ЗООТЭХНІК УЛАСЕНКА, работнік зоаветінстытута Самахвалаў гаварылі аб дрэнным становішчы МТФ, неправільным доглядзе за жывёлай, аб шкодніцкіх часта адносінах да яе, але ўсе яны ні слова не сказалі аб тым, як яны самі дрэнна на справе кіруюць гэтым адказнейшым участкам, што самі яны з'яўляюцца толькі фіксатарамі гэтых недахопаў, што нічога канкрэтнага не прынялі для наладжвання работы, выкрыцця вінаватых у дрэннай пастаноўцы работы, выкрыцця шкоднікаў—класавых ворагаў пралезшых на стайні МТФ, свінарнікі і г. д.

Але вось на трыбуну ўзышоў ўжо стары, але бадзёры, у чорнай скуранай куртцы конюх калгаса „Малая чэрніца", Замастоцкага сельсовета тав. Ганчароў. Слухаў я таварышы вашы размовы, слухаў я гэтую чмуру, аж больш цярпення не стала. Самі вы, і ніхто больш, вінаваты ў непаладках, у дрэннай рабоце. Загляньце ў наш калгас і вы ўпэўніцеся, як намі, калгаснікамі, нашымі рукамі, пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі, пабудавана каменная абора, стайня, целятнікі, скотнікі, памешканні ацеплены, кармамі жывёла забяспечана і зімаваць ёй будзе вельмі добра». Аб гэтым-жа і сказаў загадчык МТФ гэтага калгаса тав. Бабкоў.

Калгасніца Шэірэева з калгаса „Шлях Ільіча", Дуўжанскага сельсовета разказвае: „Свінні ў нас у калгасе тазіліся ў брудзе, зімой стаялі пад адкрытым небам і мне прыходзілася парасят пасля апароса матак у сваёй хаце тыднямі даглядаць. Было ўсяго 4 маткі і храк. Зараз я выгадавала стада ў 19 штук свіней. Але-ж старшыня калгаса Багданаў і зараз злачынна бяздзейнічае. Свінні не маюць памяшкання, усе хракі, маткі і парасяты знаходзяцца ў адным невялічкім хляву. Так, нацалей працягвацца не можа. Старшыня калгаса павінен свіней забяспечыць памяшканнем і кармамі.

Нарада з усёй відавочнасцю паказала, што справа жывёлагадоўлі ў раёне знаходзіцца ў яўна небяспечным становішчы.

На гэткім адказнейшым участку як барацьба за разгортванне соцыялістычнай жывёлагадоўлі, маецца значная засмечанасць класава-варожымі элементамі Так зусім нядаўна мелі месца агідныя контррэволюцыйныя выпадкі ў галіне жывёлагадоўлі ў калгасах Бараўлянскага і Сялюцкага сельсоветаў.

Засеўшыя кулакі губяць малако, прыводзяць да страт, зразумела, што калі б страт было менш, то было б больш прадуктаў калгаснікаў на працадзень, багацей была-б і кармавая база.

Ад нас і толькі ад нас саміх залежыць, каб у нас было для жывёлы больш корма, каб у нас былі добрыя, цёплыя, светлыя і чыстыя памяшканні, добрая зімоўка, добрая жывёла.

І вось адсюль перад намі, як гэта асабліва падкрэсліў у сваім выступленні т. Жураўлёў пярвейшая задача—задача падрыхтоўкі кадраў.

Неабходна ўстанавіць пільны нагляд за жывёлай, скарыстаць усе маючыяся ў нас магчымасці для паляпшэння яе ўтрымання.

Ударнікі, лепшыя калгаснікі, а не разгільдзеі павінны заняць месца ва ўсіх галінах жывёлагадоўлі. Трэба падабраць, праверыць і зацвердзіць гэтыя кандыдатуры так, каб сюды ні пад якім выглядам не мог пралезці кулак і кулацкі падпявала.

Трэба з усёй праматою адзначыць, што гарза ў адносінах кадраў жывёлагадоўлі нічога не робіць, а справа-ж у жывых людзях Трэба ўмець работаць, ведаць работу, любіць работу. Без гэтага грош цана работніку.

Наша задача—кіраваць аперацыйна. Між тым менавіта вось гэтага—аперацыйнасці—і не хапае ў ва ўсёй рабоце па кіраўніцтву жывёлагадоўляй.

Праведзенная нарада, з усёй відавочнасцю паказала, што абазлічка—злейшы вораг развіцця жывёлагадоўлі. Возьміце калгас імя Сталіна, Рудніцкага сельсовета, аб якім гаварыў у сваім выступленні на нарадзе т. Жураўлёў. Хаос, злачынствы, абазлічка ў гэтым калгасе даведзены да крайнасці, там людзі не хварэюць за даручаную ім справу. Гнаць такіх людзей трэба, бо яны разлагаюць гаспадарку. Хамуты, абросці і ўся збруя да каня не падагнаны, не замацаваны, парасвіданы. Калі патрэбна запрэгчы каня, то трэба вельмі многа часу, каб падабраць да яго ўсе прылады. Цялегі рамонтуюцца так,—спіцы да кола робяцца новыя, а абод нацягваецца стары. Праехаўшы на такой цялегі адзін дзень, кола і разваліваецца. Гэткая абазлічка прывяла да гібелі коняй у калгасе, да вялікага прарыва ў сельска-гаспадарчых работах.

Усё гэта разам узятае, усе матэрыялы праведзенай нарады з'яўляюцца моцным папярэджальным сігналам аб буйнейшых прарывах у справе жывёлагадоўлі ў Віцебскім раёне. безадкладная ліквідацыя якіх—баявая задача.

НЯМА БОЛЬШ ПАЧЭСНАЙ ЗАДАЧЫ ДЛЯ ЗМАЗЧЫКА ЯК ЛІКВІДАВАЦЬ ГАРЭННЕ БУКС.

У пакоі змазчыкаў ажыўлена гутарылі. Тэма—не новая. Аб буксах. Аб прычыне гарэння. Аб прафілактычных мерах.

Ці можна ўнікнуць адцэпак па віне змазчыкаў? Спрачаліся і ў гэты дзень. З лістапада, як і напярэдадні, як і кожны дзень. Адны „даказвалі", што не можа на быць адцэпак. Другія—што адцэпкі залежаць выключна ад таго, як змазчык адносіцца да буксы, як да яе адносіцца слесар, як да яе адносіцца агляднік.

Спрачанні пераварваліся ў тэхнічную нараду. З той толькі розніцай, што на гэты раз яна праводзілася без фармальнага абвяшчэння, без старшыні. Ініцыятыву ўзялі на сябе ўдарнікі.

* * *

Гаварыў герой пяцігодкі тав. Місурагін.

— Не, не правы тыя, хто сцвярджае, што гарэнне букс—хвароба хранічная, незлячымая.

— 17 год я змазчыкам. У мяне не бывае адцэпак. Чаму? Ды вельмі проста. Ад мінуты пачатка прыёмкі цягніка да апошняй мінуты ўхода яго, я не выпускаю буксу з пад увагі. Змазчык, калі ён жадае, што б па яго віне не было адцэпак, абавязан сам усё дэталёва правяраць, сам за ўсякай дробяззю сачыць.

Выступіў змазчык Гарбаценка.

— Што часцей за ўсё выклікае гарэнне? Дрэнна падагнаны падшыпнік, нячыстая шыйка, не па размеры шыйкі халадзільнік, неправільна пастаўленая вось, сухая падбіўка. Трэба своечасова ўскрываць хворыя буксы. Выяўляць прычыны хваробы. Перш за ўсё паглядзець верхнюю буксу, ці не выра батана гняздо. Звярнуць асаблівую ўвагу на ніжнюю буксу, ці не трэ яна заднім борцікам туліцу. Праверыць ці правільна палажэнне падшыпніка.

А ў нас як робяць?

Звычайна робяць так: буксу дасканала не правяраюць, паглядзяць яе выгляд знадворку, і лічаць, што работа закончана. У большасці гэта даты чыцца аглядчыкаў.

— Калі мы больш уважліва самі будзем сачыць за буксай, мы забяспечым значнае зніжэнне выпадкаў адцэпак па гарэнні букс, забяспечым поўнае знішчэнне адцэпак па гэтай прычыне.

Узяў слова змазчык Кузняцоў.

— Самае галоўнае—трэба звярнуць увагу на вагон у пуці. Ці няма дыма, ці не чуваць піску. Тут трэба глядзець у абодва і вуха трымаць востра У выпадку, калі пачуеш малейшы піск, трэба неадкладна на бліжэйшайжа кантрольнай станцыі вызвіць прычыну.

— Такім доглядам я доўгі час унікаў адцэпак па гарэнні букс А вось нядаўна, як на ліха, я прахлопаў. Знаходзіўся я ў хваставой часці цягніка. І не прыкмеціў піска—весніка гарэння. Прышлося зрабіць адцэпку. Мане за гэта вывелі са склада ўдарвікаў.

— Гавару прама: калі добра па-гаспадарску адносіцца да буксы, яна па нашай віне хварэць не будзе. і адцэпак па нашай віне тады не будзе.

Палічыў патрэбным выступіць і змазчык Карэлін.

— У маёй практыцы былі адцэпкі. Гэта ў першы час, калі я быў яшчэ тэхнічна неісьменным Рабіў пад біўку я тады, праўду кажучы, шыварат на вываварат. Мяне спарылі з добрым вопытным змазчыкам, майстрам буксы, тав. ШНІПАВЫМ. Ён мне дапамог З-раз я ўжо сам ўладаў тэхнікай змазкі. Некалькі месяцаў я не ведаю адцэпак па сваёй віне. За добрую работу маю гонар насіць імя ўдарніка.

На ступным узяў слова змазчык Ягарэнка.

У мяне амаль на працягу года не было адцэпак. У верасні была адна па зносу буксы. Што патрэбна, каб букса была здарова? Перш за ўсё яна павінна быць падвінчана ўплатную. Фіцель павінен быць чыстым і закладзен вольна, каб добра мог упітваць у сябе масла. Добра трэба заліць верхнюю каробку буксы. Пры астаноўцы цягніка—абавязкова правяраць кожную частку буксы, асабліва верхнюю каробку ці няма нагрэва.

— Я, калі правяраю буксу, гляджу усё: ці досыць масла, ці не зношан падшыпнік, ці няма парэзаў на шыйцы. 22 гады маёй практыкі змазчыка ўпэўнілі мяне, што здароўе буксы можа забяспечыць выключна добры догляд за ёю.

Згадзіўся з выступленнем тав. Ягарэнкі і змазчык Сычаў.

— Вось на працягу ўжо некалькіх месяцаў зраду я атрымліваю ўдарную картку. А дабіўся я гэтага гонара толькі тым, што душой хварэю за буксы. Апошнія два-тры месяцы ў мяне не было ніводнай адцэпкі. Гэта мяне пераканала, што ад нас саміх, змазчыкаў, залежыць не мець адцэпак вагонаў па нашай віне.

І нарэшце заключны нараду змазчык Цітоў.

— На многа раней, чым прыходзіць цягнік, я ўжо чакаю яго прыёмку ў поўнай гатоўнасці.

— Усяго тры месяцы, як я работаю змазчыкам. За гэты час меў толькі адну адцэпку па маёй віне. Але я спадзяюся добрым доглядам буксы дабіцца таго, каб не мець ніводнай адцэпкі.

* * *

Старыя, вопытныя змазчыкі тажам ад 10 да 22 год тт. ЯКА, МІСУРАГІН, ГАРБАЦЕНКА, падыя, работаючыя на змазцы месяцаў да 2 год тт. ЦІТОЎ, КАРЭЛІН сайшліся на адным: па віне змазчыкаў можна ўн Гэта паказала практыка стары страў. Значыць трэба работаць як работае Місурагін, як Ягарэнка, як работае Сычоў. па-гаспадарску даглядаць за

У адцэпках значная доля він сараў і аглядчыкаў. Работаюць сары і аглядчыкі безадказна. 50 адцэпак бывае з за нарэзаў з за дрэнна прывінчанай буксы.

Зусім нядаўна, 2 лістапада, № 746 на першай-жа астаноўц Віцебска прышлося затрымаць мінут таму, што цягнік быў а лен пасля агляда з хворымі бу

Безадказнасць слесароў і агл каў (начальнік пункта агляда ЧУН) увайшла ў сістэму. Сі якая мяжуе са шкодніцтвам, б прыводзіць да разбурэння ваго гаспадарцы.

Нельга гэта царпець надалей. спарт уступае ў адказнейшы —вімовы час работы. На бук гаспадарку патрэбна звярнуць а вую ўвагу.

Няма ніякага сумнення, што п аддзел, узяўшы і гэты ўчастак свой большавіцкі кантроль, маб ваўшы масу змазчыкаў, даб'ецца нага знішчэння адцэпак вагонаў гарэння букс.

Слесар—агляднік— змазчык — тры звяна аднаго ланцуга, ад я залежыць нармальны рух цяг Усе гэтыя тры звяна павінны сапраўднымі. Слесар—агляднік—з чык, кожны з іх павінен адч адказнасць за здароўе буксы

ЧЭРНЯЎСКАЯ

Правяраем выкананне сорэвнавання воднікаў з чыгуначнікамі.

Па лепшых браць раўнанне.

101,6 процантаў. Гэтымі лічбамі сустрэў XVI гадавіну Кастрычніка віцебскі раённы рачны транспарт. На 101,6 проц. выканан навігацыйны план на 1 лістапада.

З лепшымі колькаснымі і асабліва якаснымі паказальнікамі прышлі да свята буксірны параход „АСІЛАК"—107,6 проц. і віцебская ПРЫСТАНЬ—131,5 проц. З дрэннымі паказальнікамі прышлі параходы „МЮД"—76,8 проц., „ВЯЛІСА"—80,9, „ВАЛКАТА"—94,8 проц.

Параход „АСІЛАК" заваяваў першае месца па Віцебскаму раёну і трэцяе месца па басейну ў другім усебасейнавым конкурсе-спаборніцтве на лепшае выкананне трафіплана. Конкурсная камісія прэміявала каманду „Асілка" на суму 1 000 рублёў. Параход захоўвае першынство і ў конкурсе воднікаў з чыгуначнікамі на лепшае правядзенне асенніх перавозак.

Тут можа паўстаць пытанне: чаму не „Таропа", не „Калгаснік" і не „Комсамолец", якія выканалі план перавозак, не прышлі першымі да фініша?

Справа ў месце лічбаў 107,6 проц. „Асілка" складаюцца з: СВЯДОМАЙ ЖАЛЕЗНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ, УЗОРНАЙ КУЛЬТПАЛІТМАСАВАЙ РАБОТЫ, ТЭХ ВУЧОБЫ, СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ МЕТАДАЎ ПРАЦЫ. Калектыў „Асілка" зразумеў тыя задачы, якія перад ім пастаўлены, і па-баявому, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, за іх змагаўся.

Лічбы выканання навігацыйнага плана другіх трох адзінак —„ТАРОПЫ", „ДЗВІНЫ" і „КОМСАМОЛЬЦА" складаюцца толькі з колькаснага выканання плана. Якаснымі паказальнікамі ніводная з гэтых адзінак, нават „Дзвіна", якая у першы час навігацыі па масавай рабоце была ўперадзе, пахваліцца не могуць Хішчэнне грузаў на „Комсамольцы" (за гэта адда дзена пад суд шэсць чалавек з каманды), п'янкі на „Тароце", парушэнні працэдыцыплины на „Дзвіне". ставяць гэтыя адзінкі, не гледзячы на іх колькасныя паказальнікі, па-за радамі перадавікоў.

Усебасейнавая конкурсная камісія прэміявала трэцяй прэміяй прыстаньскую брыгаду тав. ГОЛЬБРАЙКА. Гэта брыгада, асабліва пасля ўключэння ў конкурс воднікаў з чыгуначнікамі, разгарнула палітмасавую работу ўнутры брыгады і гэтым дабілася ўзорнай дысцыпліны. Дысцыпліна і правільная расстаноўка сіл у брыгадзе Гольбрайха за самы напружаны час перавозак—кастрычнік—дала паказальнікі 129 процантаў, пры добрай якасці.

Першынства аспрэчвала ў гэтай брыгады другая прыстаньская брыгада т. АКУНІНЦА, таксама ўключыўшаяся ў конкурс воднікаў з чыгуначнікамі. Аднак, у брыгадзе Акунінца, не гледзячы на адносна лепшыя паказальнікі з брыгадай Гольбрайха, яшчэ не знішчаны парушэнні працоўнай дысцыпліны, яшчэ слаба разгорнута масавая работа.

Менавіта так і ставілі воднікі пытанне на ўрачыстым вечары, прысвечаным XVI Кастрычніку, калі зачытвалі вынікі ўсебасейнавага конкурса. Змест паказальнікаў—розны. У гэтым —сэнс.

САМЫ НАПРУЖАНЫ ЧАС—ЗАРАЗ.

Завяршаецца навігацыя. Кожную гадзіну лёд пагражае скаваць раку. Дасягненні, якія атрымаў пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі, віцебскі раённы рачны транспарт у на гацыйны час, ні ў якім разе павінны ніякага супакоіць. Перад в нікамі, перад кожным воднікам пасс ку велізарная важнасці задача—зм гацца а тое, каб на беразе не зас лося ніводнага кіло груза, каб ніво кае кіло груза, асабліва гародніц не папсавалася ад мароза. ЯШ БОЛЬШ НАПРУЖАНЫМІ ТЭМПА ПАВІНЕН РАБОТАЦЬ КОЖНЫ З В МАНДЫ ПАРАВОГА ФЛОТА, КОЖЕ КОРНІК ЛАНБЫ, КОЖНЫ ГРУЗЧ НА БЕРАЗЕ.

* * *

Ударнікі водкага транспарта Віцебскага раёна звярнуліся да трыкутні басейна з прапановай абмяркаваць ус басейнавы конкурс - спаборніцтва лепшае правядзенне зімовага суд рамонта.

ГЕЛЬМЕС

НА ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ЎДАРНІКАЎ ЖАКТАЎ.

4 лістапада ў вялікай зале Палаца працы

БАРАЦЬБА ЗА УЗОРНЫ ЖАКТ ПРАЦЯГВАЕЦЦА!

Фініш агляда жактаў гэта пачатак далейшага змагання за паляпшэнне рабочага быта, пачатак далейшай барацьбы за канчатковую ліквідацыю адставання жактаў, Барацьба за узорны жакт—састаўная частка барацьбы за правядзенне сталінскага пахода.

Стрэлка гадзінніка набліжалася да 7 гадз. вечара Паступова адзін за адным прышлі ўдарнікі жактаў на сваю перадкастрычніцкую канферэнцыю. Уся зала Палаца працы напоўнілася людзмі. 375 прадстаўнікоў ад жактаў горада, лепшых пайнікаў ударнікаў жактаўскай работы прыйшлі на канферэнцыю, каб падвесці вынікі праробленай на працягу двух месяцаў работы, каб падагуліць праведзены агляд работы жактаў і становішча падрыхтоўкі рабочых кватэр да зімы.

У калідоры лепшыя жакты арганізавалі выстаўку сваіх насценных газет. Вось насценгазеты 11, 10, 4 жактаў. Гэтыя нумары насценгазет, прысвечаныя завяршэнню агляду, красамоўна гавораць аб тым, як агляд работы жактаў шырока ўскалыхнуў ўсю пролетарскую грамадскасць, мабілізаваў на яшчэ больш моцную барацьбу за далейшае паляпшэнне рабочага быта.

Адкрываючы канферэнцыю ўдарнікаў жактаў, старшыня гарпрафсовета т. КРЫМКЕВІЧ спыніўся на канкрэтных задачах, якія стаяць перад жактамі, як магутнымі ачагамі паляпшэння рабочага быта. Ён завастрыў увагу на тым, што бюро гаркома партыі ў сваёй пастанове ад 4 лістапада рашуча падкрэсліла, што сталінскі паход па арганізаванай сустрэчы зімы праходзіць па гораду нездавальняючы і гэта стрэснае напярэджанне жакты павінны ўлічыць, каб навярстаць упушчанае і сустрэць зіму па-баявому

Абіраецца прэзідыум у складзе т.т. ЖУРАЎЛЁЎ—сакратар гаркома партыі, БАСКІН—старшыня гарсовета, КРЫМКЕВІЧ—старшыня гарпрафсовета, ВЕРЖБАЛОВІЧ—нам. адказнага рэдактара газеты «Віцебскі пролетарый», БАЗАКЕВІЧ — гаржылсаюз, ЗЕЛІКСОН (рэдакцыя), АВРУСКІН, (гарпрафсовет) і лепшыя ўдарнікі жактаўскай работы т.т. САДКЕВІЧ (10 жакт), КАМІНСКІ (дворнік), ЗАЙЦАВА (16 жакт), МЯДЗВЕДЗЕВА (33 жакт) і інш.

Слова для даклада аб выніках агляда работы жактаў і далейшых задачах іх работы атрымлівае старшыня гарсовета т. БАСКІН.

Яшчэ больш разгорнем барацьбу за ўзорны жакт!

ГАВОРЫЦЬ ТАВ. БАСКІН.

Мы сёння сабраліся—кажа т. БАСКІН—абгаварыць важнае пытанне, якое мае выключна адказнае палітычнае значэнне ў справе паляпшэння соцыяльна - бытавых умоў рабочага класа. Гэта мае актуальнейшае значэнне ў справе ўзмацнення нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Уся наша краіна пад кіраўніцтвам партыі і яе правадыра т. Сталіна дабілася велізарных перамог у справе паляпшэння бытавых умоў рабочага класа. Аднак, мы маем яшчэ з за нашай уласнай неарганізаванасці, недаацэнкі важнасці гэтага пытання—рад недахопаў. У прыватнасці і ў нас у Віцебску па большасці прадпрыемстваў раней гэта справа была адарвана ад вытворчага выканання плана. Нельга аўладаць высокай тэхнікай, нельга давіць высокую якасць работы, калі мы не паклапацімся аб паляпшэнні бытавых умоў рабочых. І жакты нясуць вялікую адказнасць за паляпшэнне быта рабочых. 45 процантаў усёй жыллёвай плошчы горада займае жыллёвая каперацыя Праведзены рэдакцыяй газеты „Віцебскі пролетарый" агляд работы жактаў даў безумоўна адчувальны некаторы зрух у рабоце асобных жактаў, але мы яшчэ не маем карэннага рашучага пералома ў бок паляпшэння рабочых усіх жактаў з тым, каб яны сталі ўзорнымі.

Наш урад для паляпшэння жылля рабочых адпусціў гаржылсаюзу 515 тысяч рублёў, а гаржылсаюз скарыстаў за 8 месяцаў толькі 30 тысяч. А НА ПРАЦЯГУ ДВУХ МЕСЯЦАЎ ВЯДЗЕННЯ АГЛЯДА ЖАКТАЎ СКАРЫСТАНА 107 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ. Такім чынам, як быццам каментары зусім непатрэбны, каб ахарактарызаваць работу гаржылсаюза. Гаржылсаюз не скарыстаў тых магчымасцяй, якія ёй мае. Гаржылсаюз часта скардзіцца, што ў яго няма неабходнай колькасці матэрыялаў і прыходзіцца канстатаваць, што гаржылсаюз не мабілізаваў сваіх унутраных рэсурсаў, а карыстаецца тым матэрыялам, што адпускаецца ў планавым парадку. Патрэбна шырокая ініцыятыва і самадзейнасць саміх пайнікаў, гаржылсаюза і жактаў для таго, каб зрабіць кожную кватэру рабочага і працоўнага цёплай, чыстай, утульнай да зімы. Сродкі на гэта ў нас ёсць. Урад адпусціў нам дадаткова яшчэ 150 тысяч рублёў для далейшага паляпшэння жыллёвых умоў рабочых Віцебска.

Тав. БАСКІН на канкрэтных фактах паказвае становішча работы асобных жактаў, спыняецца на ажыццяўленні фінансавай дысцыпліны і аховы грамадскай маёмасці, снабжэння рабочых дравамі. У канцы даклада ён гаворыць:

— Праведзены сталінскі паход па арганізаванай сустрэчы зімы ставіць перад намі задачу, каб чула прыслухоўвацца да запатрабаванняў рабочага. Гарком партыі абгаварыўшы пытанне сталінскага пахода і ўдзеле ў ім прафсаюзных арганізацый, жактаў канстатаваў, што гэтыя арганізацыі не зрабілі пералома ў рабоце. Гарком партыі вылучыў спецыяльную надзвычайную тройку па кіраўніцтву паходам і пастанавіў сталінскі паход працягваць далей. Зараз задача заключаецца ў тым, каб замацаваць той зрух у рабоце жактаў, які намеціўся, бо мы бачым, што там, дзе людзі работалі па-большэвіцку, усвядомілі палітычную сутнасць сваёй работы ў барацьбе за паляпшэнне рабочага быта—там мы маем сапраўдны зрух. ВОСЬ У ЧАС АГЛЯДА, ПА ЗВЕСТКАХ ГАРЖЫЛСАЮЗА АДРАМАНТАВАНА 889 КВАТЭР, 800 МЕСЦ ПА ЖАКТАХ ПРАДАСТАЎЛЕНА ДЛЯ НОВЫХ РАБОТНІЦ ФАБРЫКІ „КІМ". Усё гэта гаворыць аб тым, што патрэбна большэвіцкая настойлівасць і шырокае разгортванне ініцыятывы і самадзейнасці саміх пайнікаў, каб дабіцца рашучага пералома ў паляпшэнні рабочага быта, з тым, каб кожную кватэру працоўнага, кожны дом падрыхтаваць да зімы так, каб яны былі цёплымі, чыстымі, утульнымі.

— Я вас заклікаю—заканчвае тав. БАСКІН—да яшчэ больш рашучай і ўзмоцненай барацьбы за ажыццяўленне пастаўленай перад намі партыяй і правадыром т. Сталіным задачы паляпшэння соцыяльна-бытавых умоў рабочых, бо «няма больш ганаровай задачы для большэвіка-рэволюцыянера, які змагаўся дзесяткі год за справу рабочага класа як справа дапамогі рабочым, справы паляпшэння становішча рабочых» (КАГАНОВІЧ)

Пасля даклада тав. БАСКІНА шырока разгарнуліся ажыўлёныя спрэчкі—ударнікаў жактаўскай работы.

Ураўнілаўка, яшчэ не выкарчавана.

КАСТРЭЛІКАЎ—УДАРНІК ЖАКТА № 21.

Расказвае канферэнцыі аб тых рэзультатах, якіх дабіўся 21 жакт у часе агляда. Але гэты жакт мае яшчэ рад недахопаў. Ёсць рад выпадкаў, калі рамонт у першую чаргу вытвараецца у кватэрах маючых запазычанасць па квартплаце. Нама яшчэ дыферэнцыяванага падыхода да пайнікаў.

Кожны фэбзаўмясцком адказны за работу жакта.

ТАВ. ЗЛАТКІН—ЖАКТ № 14.

Над жактамі шэфствуюць прадпрыемствы горада. Аднак, яшчэ не адчуваецца, каб асобныя прадпрыемствы сапраўды аказвалі дапамогу жактам. І тут, трэба проста сказаць, гарпрафсовет не праверыў як асобныя фабзаўкомы ажыццяўляюць шэфства, дапамагаюць жактам, аказваюць ім пролетарскае садзейнічанне. У далейшым трэба, каб кожны фабзаўмясцком меў канкрэтны практычны план сваёй работы ў падшэфным жакце, каб жакт адчуваў дапамогу прадпрыемства.

Як мы перавыхавалі „гразнюх".

ТАВ КЛЯЧКО—ЖАКТ № 12.

Мы ў рабоце нашага жакта мелі многа недахопаў. 12 жакт па сваёй рабоце быў адным з самых горшых жактаў горада. Агляд жактаў зрабіў яго перадавым. Наш жакт з вялікімі поспехамі прышоў да гэтай канферэнцыі. У нашым жакце мелася многа „гразнюх" (Каган). Мы іх размяквалі і выставілі ў вітрынах магазінаў па Ленінскай вуліцы Гэта мерапрыемства многа дапамагло. Былыя «гразнюхі» зараз трымаюць свае кватэры ў чыстаце. Нам зараз патрэбна закончыць рамонт, а ў нас няма дастатковай колькасці будаўнічых матэрыялаў Гаржылсаюз павінен правяць тут максімальную энергію ў своечасовай дастаўцы гэтых матэрыялаў, каб у бліжэйшы час мы маглі-б поўнасцю закончыць рамонт.

Чаму наш дом самы прыкладны і ўзорны?

АБЕЛЬСКАЯ—ЖАКТ № 4

Я сёння хачу расказаць як я, упаўнаважаны дома, дабілася, што мой дом самы прыкладны і ўзорны ў жакце. Я пачала з таго, што навяла парадак на кухнях. Ва ўсіх кухнях дома ўстаноўлены дзяжурствы пайнікаў—кожны ведае, калі ён дзяжурыць. У абавязкі дзяжурных уваходзіць навесці і сачыць за чыстатой і парадкам на кухні. Я хачу таксама адзначыць і тое, што ў нас у доме пражывае ЗАПАЛАЎ, які трымае сваю кватэру ў чыстаце, але на кухні заўсёды лужы і груды мусара і кухню ён ніколі не прыбірае.

Гаржылсаюз у ролі „башни молчания".

Тав. ЗАЙЦАВА—ЖАКТ № 16.

Хачу адзначыць, што гаржылсаюз рэдка, вельмі рэдка заглядвае ў жакты і таму не ведае, што там тварыцца. Ён не ўзначаліў своечасова рамонтнай справы ў жактах з тым, каб правесці яго паспяхова ў гэтым годзе. Той яркі факт, які ў сваім дакладзе прывёў тав. Баскін аб тым, што не скарыстоўваюцца сумы адпушчаныя нашым урадам для жыллёвай капераціі кажа аб тым, што гаржылсаюз яшчэ не перабудаваў сваю работу, каб аперацыйна кіраваць жактамі, дапамагчы ім у рабоце.

* * *

Пасля спрэчак прымаецца прапанова даручыць прэзідыуму гарпрафсовета выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па далейшым разгортванні сталінскага пахода ў жактах па арганізаванай сустрэчы зімы.

Далей гаржылсаюз прыступае да ўрачыстага прэміявання лепшых жактаў, якія паказалі ўзоры ўдарнай работы ў час агляда работы жактаў, завяршаюць рамонт рабочых кватэр. Жакт № 4 прэміяван на суму 300 р., жакт №12—200 руб., жакт № 21—200 руб. Акрамя таго гэтыя жакты атрымалі ганаровыя граматы Пастановай гарсовета за ўзорнае абсталаванне інтэрнатаў для «КІМ» прэміяван упраўдамамі жакта № 10 т. ГАРЧАКОЎ на суму 300 руб., старшыня жакта № 12 т. КЛЯЦКО—100 руб., т. АНЦІХОВІЧ упраўдамамі—100 руб. т. СУВОРАЎ —старшыня жакта № 21—100 руб., т. ЗЛОТНІКАЎ упраўдамамі—100 р., т. РОЗІН (жакт № 14)—200 руб., т. ЯФРЭМАЎ ІВАСЬ дворнік—поўме сячым акладам, т. МЯДЗВЕДЗЕВА член праўлення жакта № 33—на суму 40 руб. і граматай, т. МІРЫН (старшыня жакта № 33)—50 руб. і граматай, т. САДКЕВІЧ (ударнік ак тывіст жакта № 10—100 р. т., АБЕЛЬСКАЯ (лепшы ўлаўнаважаны дома жакта № 4)—100 руб., т. КАМІНСКІ (дворнік) — поўмесячным акладам пенсіі, т КАТЫШАЎ (жакт № 10), т. ІГНАЦЬЕВА (рахункавод), СВЕРДЛІН (жакт № 20), т. ІСЯКОЎ (дворнік жакта № 20), т. ГІБОВІЧ, т. МІХАЙЛАЎ (дворнікі 4 жакта), т. ЗАЙЦАВА (жакт № 16) і інш.

* * *

Такім чынам лепшыя ўдарнікі жактаўскай работы адзначаны і прэміяваны на канферэнцыі. Ім гонар і пашана. Па іх трэба трымаць раўнанне, ад іх трэба вучыцца як змагацца за ўзорны жакт. А задача прэміяваных—яшчэ больш замацаваць дасягненні, не падацца правам „галавакружэння" ад поспехаў, а пайсці па шляху далейшых, яшчэ больш глыбокіх і грунтоўных перамог у справе паляпшэння рабочага быта.

* * *

Агляд работы жактаў скончыўся. Аднак, гэта не значыць, што закончылася ўся барацьба за ўзорны жакт. Наадварот ФІНІШ АГЛЯДА ЖАКТАЎ ГЭТА ПАЧАТАК УЗМОЦНЕНАГА ЗМАГАННЯ ЗА ПАЛЯПШЭННЕ РАБОЧАГА БЫТА. ГЭТА ПАЧАТАК ДАЛЕЙШАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА КАНЧАТКОВУЮ ЛІКВІДАЦЫЮ АДСТАВАННЯ ЖАКТАЎ, ЗА ЗНІШЧЭННЕ РАСХЛЯБАНАСЦІ, РАЗГІЛЬДЗЯЙСТВА, АЛІЛУЙШЧЫНЫ І БЕЗАДКАЗНАСЦІ Ў ІХ.

БАРАЦЬБА ЗА ЎЗОРНЫ ЖАКТ ПРАЦЯГВАЕЦЦА. Наша задача заключаецца ў

Шчырае большэвіцкае прывітанне рабоча-сялянскай міліцыі—вернаму вартавому рэволюцыйнай законнасці!

ДЗЕНЬ XVI ГАДАВІНЫ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МІЛІЦЫЯ ПАВІННА АДЗНАЧЫЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШЫМ УЗМАЦНЕННЕМ СВАЁЙ БАЯЗДОЛЬНАСЦІ, ПАВЫШЭННЕМ КЛАСАВАЙ ПІЛЬНАСЦІ, ПАЛІТЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ І САМАЙ МОЦНАЙ, НЕПАСРЭДНАЙ СУВЯЗІ З МАСАМІ ПРАЦОЎНЫХ.

Мацней барацьбу за санітарнае аздараўленне горада.

Санітарнае аздараўленне аднаго з буйнейшых пролетарскіх цэнтраў Беларусі—горада Віцебска з'яўляецца справай гонара,—віцебскай гарадской міліцыі.

У гэтай справе да сваёй XVI гадавіны віцебская гарміліцыя мае некаторыя дасягненні. Пролетарская грамадскасць горада, пад кіраўніцтвам гарадскога камітэта КП(б)В і гарсовета ўключылася ў дапамогу рабоча-сялянскай міліцыі на штурм прарыва па саназдараўленні і барацьбу за здаровыя санітарна - бытавыя ўмовы жыцця працоўных горада.

У выніку гэтага дасягнута некаторае паляпшэнне санітарнага становішча вуліц, двароў, кухань, месц грамадскага карыстання.

Віцебскай гарміліцыяй абвешчан дэкаднік штурма па саназдараўленні горада, які характарызуецца наступнымі паказчыкамі:

На ачыстцы працавала 2 аўтамашыны, якімі зроблена 36 рэйсаў. Домаўласнікамі і прыватным транспартам прапрацавана 220 конедзён.

Пабелена кухань 91, інтэрнатаў—10.

Адрамантавана тратуараў 1874 кв. метраў.

Тыя грамадзяне, якія не хацелі вразумець усёй важнасці саназдараўлення горада і зрывалі праводзімую работу, прыцягнуты да адказнасці.

Аднак, санітарнае становішча горада яшчэ з'яўляецца нездавальняючым і патрабуе ад усіх звенняў міліцейскага апарата напружанай, энергічнай работы ў справе канчатковай ліквідацыі антысанітарыі—ачагоў распаўсюджвання заразна-эпідэмічных захворванняў, выканання вялікай палітычнай задачы, ускладзенай партыяй і ўладай на органы міліцыі ў справе санітары і добрабыта горада, укаранення ў свядомасць працоўных значэння і карысці гэтай вялікай культурнай адказнай справы.

Віцебская гарміліцыя павінна і ў далейшым весці бязлітасную барацьбу з тымі парушэльнікамі, якія шкодзяць справе стварэння здаровых культурных умоў жыцця для працоўных.

Ніводнай вуліцы, завулка, кутка, дома, кватэры і жылля горада не павінны застацца незачышчанымі.

ШКОЛЬНІКАЎ.

16 год на варце Совецкага ладу.

12 лістапада 1917 года віцебскі рэволюцыйны камітэт згодна рашэнняў СНК РСФСР арганізоўвае рабоча-сялянскую міліцыю, на якую партыяй і ўрадам ускладаецца задача—пільна ахоўваць рэволюцыйны парадак і грамадскую бяспеку.

За 16 год свайго існавання наша Чырвоная рабоча-сялянская міліцыя пад кіраўніцтвам партыі даказала на справе сваю адданасць і беззаветнасць у барацьбе за моц дыктатуры пролетарыята.

Наша рабоча-сялянская міліцыя паказала сваю баявую і самаахвярную работу і ў эпоху разгорнутага па ўсяму фронту социялістычнага будаўніцтва — пільна ахоўваючы грамадскую (социялістычную) уласнасць—аснову совецкага лада, наносячы руйнуючы ўдар па класава-варожым элементам, якія працягваюць сваю драпежніцкую лапу да социялістычнай маёмасці.

Падкрэсліваючы дасягненні ў рабоце міліцыі трэба разам з тым святкуючы 16-гадовы юбілей мабілізаваць увагу на знішчэнне тых значных прабелаў, якія маюцца ў рабоце міліцыі, бо лепшым спосабам, як гаварыў У. І. Ленін—адсвяткаваць вялікае свята—гэта значыць мабілізаваць масы на ажыццяўленне невырашаных задач.

Барацьба за поўнае ажыццяўленне наказу камісіі па чыстцы партарганізацыі віцебскай міліцыі павінна легчы ва главу кута ўсёй работы кожнага міліцыянера-комуніста, комсамольца па знішчэнні маючыхся значных прабелаў у рабоце (факты нячулых адносін асобных міліцыянераў да рэагавання на заявы, недастаткова ўпартая барацьба з спекулянтамі і перакупшчыкамі, слабасць барацьбы за чыстату горада, за правільны вулічны рух).

Ахова соцыялістычнай маёмасці, барацьба з пасягацелямі на яе, з ворагамі народа—зараз галоўнае ў рабоце міліцыі.

Больш рашуча трэба павесці самую настойлівую і кожнадзённую барацьбу са спекулянтамі, перакупшчыкамі, якія спрабуюць пажывіцца яшчэ за лік працы калгаснікаў і рабочых.

Змагацца за ўзорны рэволюцыйны парадак, за ўзорны стан аднаго з буйнейшых у БССР пролетарскіх гарадоў, ачышчаючы свае рады ад выпадкова прымазаўшыхся чуждых элементаў, узнімаючы класавую пільнасць і баяздольнасць, палітычную свядомасць і баявую падрыхтоўку байца—работніка міліцыі — такава задача.

Нам неабходна паставіць узорна работу асодміла, бо кожнадзённая падтрымка з боку ўсёй пролетарскай грамадскасці, з боку шырачэзных мас рабочых і калгаснікаў—асноўны залог паспяховасці ўсёй работы рабоча-сялянскай міліцыі, як вернага вартавога рэволюцыйнай законнасці.

МІЛІЦЫЯ З'ЯВІЛАСЯ ДЛЯ МЯНЕ ЛЕПШАЙ ШКОЛАЙ.

У рабоча-сялянскую міліцыю я ўступіў у 1928 годзе ў якасці малодшага міліцыянера. За час маёй працы у кавалерыйскім узводзе я маю наступныя дасягненні: усваенне палітпраграмы на добра, вінтоўку, «наган» і іншую зброю ведаю атлічна. За час маёй службы не маю ніводнага дысцыплінарнага спагнання. За добрае нясенне службы я маю дзве падзякі і тры разы прэміяван, як лепшы ўдарнік у баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

Усе праводзімыя мерапрыемствы па выхаванні рабоча-сялянскай міліцыі кажуць, што міліцыя сапраўды з'яўляецца школай выхавання.

Міліцыя з'явілася для мяне лепшай школай, праз якую я маю магчымасць прымаць непасрэдны ўдзел у будаўніцтве социялізма разам з усім рабочым класам пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

ПАЎЛОЎСКІ.

На кожным прадпрыемстве, калгасе, совгасе створым моцную брыгаду садзейнічання міліцыі.

З'яўляючыся органам дыктатуры пролетарыята, рабоча-сялянская міліцыя ў сваёй рабоце абапіраецца на шырокія масы працоўных, прыцягваючы іх да непасрэднага выканання ўскладзеных на яе задач. З гэтай мэтай арганізаваны брыгады садзейнічання рабоча-селянскай міліцыі—«БРЫГАДМІЛ».

На сёнешні дзень па гораду Віцебску і раёну мы па гэтай галіне працы маем вялікія дасягненні. Калі ў 1932 годзе меліся 10 брыгад з 156 членамі ў іх, то зараз мы маем 44 брыгады з 739 членамі. Дасягненні безумоўна значныя, але на гэтым ніяк нельга заспакоіцца, таму, што мы маем у рабоце цэлы рад недахопаў.

Мы маем рад фактаў, калі на работніка таго ці іншага прадпрыемства даюць недта добрыя характарыстыкі, прымаем яго у брыгадмія, а пасля выяўляецца, што яму не месца не толькі ў брыгадміле, але і на прадпрыемстве.

Ёсць рад фактаў, калі на некаторых прадпрыемствах трыкутнікі, як, напрыклад, фабрыкі «КІМ», „Дзвіна", скуравода і інш. толькі склікаюць арганізацыйныя сходы брыгадмілаўцаў і на гэтым свае клопаты лічаць скончанымі. Кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў ніяк не хочуць зразумець, што брыгадмія гэта надзейная апора ў ахове соцыялістычных прадпрыемстваў і рэволюцыйнага парадка, што з ім патрэбна весці сістэматычную работу.

На радзе прадпрыемстваў брыгадмілы паказваюць сапраўды большэвіцкія ўзоры работы. Тут трыкутнікі зразумелі тыя вялікія задачы, якія стаяць перад брыгадмілам. Так на хлебазаводзе брыгадмід нясе дзяжурства па прадпрыемстве, сістэматычна правоядзецца палітычныя, спецыяльныя і стралковыя заняткі.

Не дрэнна абстаіць справа з брыгадмілам у радзе сельсоветаў. Некаторыя брыгады паказваюць прыклады барацьбы за ахову соцыялістычнай маёмасці (БАРАЎЛЯНСКІ сельсовет—брыгадзір СЯМЁНАЎ) і рад іншых калгасаў раёна.

Задача рабоча-сялянскай міліцыі замацаваць завербаваных брыгадмілаўцаў, наладзіць з імі вучобу, аказваць ім практычную дапамогу, увесці кожнага з іх у курс ведання яго задач. Толькі тады брыгадмія стане сапраўдным памочнікам рабоча-сялянскай міліцыі.

У гэтым вялікую дапамогу павінны аказваць рабоча-сялянскай міліцыі трыкутнікі заводаў, фабрык, кіраўнікі ўстаноў, праўленні калгасаў, дырэктары совгасаў, кожны комуніст, комсамолец, кожны працоўны.

ЯНУШКА.

Пролетарскаму Віцебску—узорны вулічны рух і здаровы механічны транспарт.

Віцебскі механічны транспарт, кіраванне дысцыплінай руху на вуліцах пакуль што яшчэ маюць рад буйных недахопаў, якія падчас цягнуць за сабой калецтвы і ахвяры людзей, псаванне і нават знішчэнне машыны.

Варта адзначыць, што для кіраўнікоў віцебскага механічнага транспарта і нават адказных за рэгуляванне вулічнага руху, тыя аварыі транспарта, якія мелі месца ў горадзе, не паслужылі ўрокам, які-б паклаў канец гэтым агідным выпадкам.

Зусім не так даўно мы мелі аварыю трактара на масту праз Заходнюю Дзвіну. Пазней факт калецтва і забойства 4 дзяцей па Ленінскай вуліцы машынай самазтранса і рад іншых выпадкаў і аварый, як аўтамашын, так і трамвая.

У мэтах аздараўлення вулічнага руху склікаліся канференцыі вадзіцелей машын, сігналізаваў аб гэтым і „Віцебскі пролетарый", але канчаткова выпадкі аварыйнасці не знішчаны, грамадскасць на гэта не мабілізавана. І таму ў апошніх ліках верасня зноў мела месца па Гарадоскаму шасе буйная аварыя, у выніку якой адна машына самазтранса знішчана, другая сапсавана. Былі калецтвы людзей. За апошні час мы мелі факты рада іншых дробных аварый.

У чым-жа сакрэт таго, што маюцца аварыі? Ці магчыма іх уніхнуць.

Безумоўна, гэта магчыма. Можна зрабіць, каб не было ніводнай аварыі. І сакрэт да гэтага ў поўным захаванні тых тэхнічных правіл небяспекі, якія для гэтага ўстаноўлены.

З кожным месяцам расце і пашыраецца механічны транспарт у горадзе і вёсцы. Адгэтуль зусім зразумела, што патрэбна зрабіць больш культурным, дысцыплінаваным рух па вуліцах, навучыць людзей правільна хадзіць па гораду. Гэта з аднаго боку, а з другога боку павысіць адказнасць водзіцеля машыны, за рух яе па вуліцы, за захоўванне тэхнічных правіл руху.

Да гэтай пары па Віцебску мы маем наступныя недахопы:

Правілы руху па гораду сярод грамадскасці належным чынам не папулярызаваны. А галоўнае, што шоферы, водзіцелі машын недапушчальна парушаюць тэхнічныя правілы руху, а мяновіта:

Рух па вуліцах горада робіцца звыш устаноўленага для гэтага кілометража ў час. Не захоўваюцца правілы абгона. У кабінцы шофера сядзяць па некалькі асоб, што не дазваляе яму належным чынам кіраваць машынай.

Да гэтага патрэбна дадаць, што паставы міліцыянер падчас ліберальна адносіцца да гэтых парушэнняў.

Для знішчэння ўсіх гэтых недахопаў патрэбна павесці адпаведную растлумачальную работу аб правілах руху па вуліцах сярод насельніцтва і рашуча ўзняць адказнасць за захаванне правіл руху сярод працаўнікоў аўтатранспарта і трамвая. Патрэбна ўзняць адказнасць за дысцыпліну вулічнага руху паставых міліцыянераў. Да тых асоб, якія злосна парушаюць правіла вулічнага руху, трэба прымаць захады адміністрацыйнага характару.

К.

КОЖНЫ МІЛІЦЫЯНЕР ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАЛІТЫЧНА АДУКАВАНЫМ.

Марксісцка-ленінскае выхаванне ў органах і часцях рабоча-сялянскай міліцыі ставіць сваёй задачай выхаваць кожнага комуніста і комсамольца, кожнага палітработніка, камандзіра і байца-міліцыянера так, каб ён мог хутка ўясняць змены тактыкі, ворагаў дыктатуры пролетарыята, зрываць з іх маскі, пад якімі яны часта хаваюцца і нанасіць па гэтых ворагах метка сакрушальныя ўдары.

Толькі ўзброены марксісцка-ленінскай тэорыяй і дыялектыкай, работнік міліцыі можа быць праваднікам рэволюцыйнай законнасці.

Комуністычная партыя пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна прывяла рабочы клас да перамогі. Лад прыгнечання, эксплуатацыі і гвалта зруйнован і на яго месца ўтворан лад без прыгнечання і эксплёатацыі—лад дыктатуры пролетарыята. Гэтым самым праведзена ў жыццё вучэнне В. І. Леніна аб тым, што «ролю перадавога барацьбіта можа выканаць толькі партыя, кіруемая перадавой тэорыяй». «Галоўнае ў ленінізме—пытанне аб дыктатуры пролетарыята, аб умовах яе заваёвы, аб умовах яе ўмацавання» (Сталін).

Рабоча-сялянская міліцыя, як узброены орган дыктатуры пролетарыята, прызвана праводзіць у жыццё задачы, па ахове рэволюцыйнага парадка, грамадскай бяспечнасці і ахове соцыялістычнай уласнасці. З гэтага вынікае, што работнік міліцыі абавязан мець рэволюцыйную пільнасць і большэвіцкую непрымірымасць да ворагаў дыктатуры пролетарыята.

Толькі ўзброіўшыся марксісцка-ленінскай тэорыяй работнік міліцыі зможа распазнаваць класавых ворагаў, пралязаючых у органы дыктатуры пролетарыята, прадпрыемствы і калгасы. «Сучасныя кулакі і падкулачнікі, сучасныя анты-совецкія элементы ў вёсцы—гэта большай часткай людзі „ціхія", «салодзенькія», амаль «святыя», каб разглядзець такога спрытнага ворага і не падацца дэмагогіі, патрэбна аўладаць рэволюцыйнай пільнасцю, патрэбна аўладаць здольнасцю, сарваць маску з класавага ворага і паказаць калгаснікам яго сапраўдны контррэволюцыйны твар».

„Моцная і магутная дыктатура пролетарыята,—вось што нам патрэбна цяпер для таго, каб развеяць ушчэнт рэшткі паміраючых класаў і разбіць іх злодзейскія махінацыі" (Сталін).

Гэта павінен зразумець кожны комуніст і беспартыйны работнік міліцыі. Аднак, марксісцка-ленінскае выхаванне ў гарнізоне міліцыі горада Віцебска да гэтага часу не стаяла на належнай вышыні. У час чысткі партарганізацыі міліцыі выяўлена, што некаторыя комуністы, нават не ведалі элементарных пытанняў па гісторыі нашай партыі.

Усё гэта абавязвае партячэйкі міліцыі і палітапарат паставіць марксісцка-ленінскае выхаванне на прынцыповую большэвіцкую вышыню. Аднак, у сучасны момант арганізаваныя партшколы і гурткі яшчэ не могуць задаволіць гэтага патрабавання. Некаторыя комуністы працягваюць ранейшую апартуністычную бяздзейнасць у партвучобе, што бачна з прыведзеных за нятку за кастрычнік.

Гурток па ленінізму—праведзена заняткаў 5, наведванне—48 проц.

Пачатковая школа пры кіраўніцтве аперсектара—праведзена заняткаў—5, наведванне—24 проц.

Пачатковая школа 4 дывізіёна—праведзена заняткаў 4—наведванне 72 проц.

Кандыдацкая школа 3 дывізіёна—праведзена заняткаў 5, наведванне 97 проц.

Кандыдацкая школа 5 дывізіёна—праведзена заняткаў 5, наведванне 83 проц.

Комсамольская школа аперсектара—праведзена заняткаў 3, наведванне 68 проц.

Гурток бягучай палітыкі пры 2 адзяленні—праведзена заняткаў—3, наведванне—33,3 проц.

Гэтая зводка абавязвае партячэйкі павесці рашучую барацьбу з недаацэнкай, якая маецца сярод паасобных комуністаў марксісцка-ленінскага выхавання і працягваюць заставацца палітычна сляпымі, бо той комуніст, які палітычна непісьменны не здолен змагацца за генеральную лінію партыі.

Р.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ.

** 95 проц. байцоў рабоча сялянскай міліцыі Віцебшчыны саставяць у радах ударнікаў, дзесяткі з іх прэміяваны.*

** За апошні час маецца аірамадны рух у працы лекутка, ажыўлён насцендрук, адзін раз у дэкаду выпускаецца дывізіённая газета, адзін раз у пяцідзённу—„Ільічоўка".*

** Выпускаюцца штодзённі ў 4 х караульных памяшканнях, ахоп падпіскі на газеты павысіўся з 7 проц. да 98, пры кожным караульным памяшканні маецца бібліятэка і газеты.*

На кожным прадпрыемстве, калгасе, совгасе створым моцную брыгаду садзейнічання міліцыі.

З'яўляючыся органам дыктатуры пролетарыята, рабоча-сялянская міліцыя ў сваёй рабоце абапіраецца на шырокія масы працоўных, прыцягваючы іх да непасрэднага выканання ўскладзеных на яе задач. З гэтай мэтай арганізаваны брыгады садзейнічання рабоча-селянскай міліцыі—«БРЫГАДМІЛ».

На сёнешні дзень па гораду Віцебску і раёну мы па гэтай галіне працы маем вялікія дасягненні. Калі ў 1932 годзе меліся 10 брыгад з 156 членамі ў іх, то зараз мы маем 44 брыгады з 739 членамі. Дасягненні безумоўна значныя, але на гэтым ніяк нельга заспакоіцца, таму, што мы маем у рабоце цэлы рад недахопаў.

Мы маем рад фактаў, калі на работніка таго ці іншага прадпрыемства даюць недта добрыя характарыстыкі, прымаем яго у брыгадмія, а пасля выяўляецца, што яму не месца не толькі ў брыгадміле, але і на прадпрыемстве.

Ёсць рад фактаў, калі на некаторых прадпрыемствах трыкутнікі, як, напрыклад, фабрыкі «КІМ», „Дзвіна", скуравода і інш. толькі склікаюць арганізацыйныя сходы брыгадмілаўцаў і на гэтым свае клопаты лічаць скончанымі. Кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў ніяк не хочуць зразумець, што брыгадмія гэта надзейная апора ў ахове соцыялістычных прадпрыемстваў і рэволюцыйнага парадка, што з ім патрэбна весці сістэматычную работу.

На радзе прадпрыемстваў брыгадмілы паказваюць сапраўды большэвіцкія ўзоры работы. Тут трыкутнікі зразумелі тыя вялікія задачы, якія стаяць перад брыгадмілам. Так на хлебазаводзе брыгадмід нясе дзяжурства па прадпрыемстве, сістэматычна правоядзецца палітычныя, спецыяльныя і стралковыя заняткі.

Не дрэнна абстаіць справа з брыгадмілам у радзе сельсоветаў. Некаторыя брыгады паказваюць прыклады барацьбы за ахову соцыялістычнай маёмасці (БАРАЎЛЯНСКІ сельсовет—брыгадзір СЯМЁНАЎ) і рад іншых калгасаў раёна.

Задача рабоча-сялянскай міліцыі замацаваць завербаваных брыгадмілаўцаў, наладзіць з імі вучобу, аказваць ім практычную дапамогу, увесці кожнага з іх у курс ведання яго задач. Толькі тады брыгадмія стане сапраўдным памочнікам рабоча-сялянскай міліцыі.

У гэтым вялікую дапамогу павінны аказваць рабоча-сялянскай міліцыі трыкутнікі заводаў, фабрык, кіраўнікі ўстаноў, праўленні калгасаў, дырэктары совгасаў, кожны комуніст, комсамолец, кожны працоўны.

ЯНУШКА.

ЯШЧЭ БОЛЬШ РАЗГАРНУЦЬ РАБКОРАЎСКІ РУХ СЯРОД РАБОТНІКАЎ МІЛІЦЫІ.

Да XVI гадавіны міліцыя Віцебшчыны падыйшла са значнымі дасягненнямі ў справе арганізацыі работы з рабкорамі і рабоце нізавога друка, які стаў сапраўдным арганізатарам міліцейскай масы на якаснае павышэнне баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

У аснову работы з рабкорамі намі, партарганізацыяй і паліткіраўніцтвам міліцыі быў узят лозунг: «Кожны ўдарнік — рабкор, кожны рабкор ударнік» і з гэтага мы пачалі. Да часу абвяшчэння конкурса па гарнізону ў 5 дывізіёне налічвалася каля 20 рабкораў. Гэтых таварышоў мы сабралі на таварыскую гутарку, растлумачылі задачу, пастаўленую перад імі, як рабкорамі. Кожны таварыш атрымаў канкрэтную тэму аб чым пісаць. Галоўная ўвага была аддана арганізацыі штодзённі ў карауле, якая павінна была стаць люстрай караула. Першая штодзёння была выпушчана 19 кастрычніка гэтага года.

Праводзячы работу сярод байцоў аб ролі нізавога друка, удасканальваючы яго ў працу, мы дабіліся да вынікаў конкурса наступнага: рабкораў мы налічваем 34 чалавекі ў 1 раздзеле, выпушчана 6 штодзённак і адна «Ільічоўка» у 2 раздзеле, а ўсяго выпушчана па дывізіёну на 6 лістапада 18 штодзённак і 3 «ільічоўкі». Гэта безумоўна з'яўляецца значным дасягненнем у справе арганізацыі работы з рабкорамі і работы нізавога друка.

Падводзячы вынікі конкурса, партарганізацыя, паліткіраўніцтвы і ўвесь калектыў міліцыі павінны замацаваць гэтыя поспехі і змагацца за далейшае паляпшэнне работы нізавога друку, і сярод рабкораў.

М. Д.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН. **МІХАІЛ КАЛЬЦОЎ.**

Іван Вадзімавіч, чалавек на узроўні.

Мы ніжэй друкуем першую частку фельетона Міхаіла Кальцова „Іван Вадзімавіч, чалавек на ўзроўні", які намі перадрукоўваецца з вышаўшага на днях пад рэдакцыяй М. Горкага альманаха „16 год"

У гэтым фельетоне Міхаіл Кальцоў таленавіта разаблачае сапраўднае нутро абываталя і кар'ерыста, ашуканскім шляхам прабраўшагася ў рады партыі і скарыстоўваючага прыналежнасць да партыі ў сваіх шкурных кар'ерысцкіх мэтах. Бязлітасна разаблачаць „Іван Вадзімавічаў", пад якой-бы маскай яны не хаваліся, яшчэ вастрэй праяўляць рэволюцыйную пільнасць на кожным з участкаў нашай работы—вось на што з вялікай выразнасцю і вастрынёй мабілізуе фельетон тав. Кальцова.

Іван Вадзімавіч хавае таварыша.

I.

— Пойдзем трохі цішэй У мяне цесныя бацінкі, а дыбаць прыдзецца далёка. Так... цяжкая гісторыя. Першага ліку мы яшчэ разам сядзелі на камісіі па сабекошту. Ён нервараваў перад дакладам—і вельмі быў рады, што добра сышло! Не ведаў, бедны, што яго чакае праз два тыдні... Хто гэта спераду ля гроба? Ах, Кандакоў. вось як! Ён тут як—ад прэзідыума, ці персанальна? Я знаём з ім толькі па тэлефону, асабіста ніколі не бачыў. Аднак, малады.. У такім узросце быць членам прэзідыума—гэта не дрэнна. У апошні час папёрла зусім нейкая новая публіка. Невядомыя людзі. Гаворыць, з партыйнага апарата многа пераводзяць на гаспадарчую работу. Гонар у іх вялікі .. Мобыць, ён і свае часова памёр. У калегіі да яго пачалі вельмі дрэнна адносіцца... З кім трэні—са мной? Гэта чыстая хлусня! Мне ён ніколі не шкодзіў. Я быў сапраўды ўзрушан яго смерцю. Якая хлусня! Я ведаю, хто гэта вам сказаў. Гэта Круглякоўскі! Не спрачайцеся: ясна, Круглякоўскі. Не разумею, навошта ён распаўсюджвае гэткія чуткі. Я ўжо ад трэцяга чую. Прыдзецца з ім пагаварыць..

У крэматорыі? Не, ужо ў трэці раз. У пяршыню я быў—у нас адзін супрацоўнік памёр. а пасля на пахаваннях Пятра Барысавіча; ці ж вас тады не было? Прыгожыя хаўтуры былі. Маса народу, вянкі, музыка, прадстаў нік ад прэзідыума, сцягі. Яму самому, канешне, нічога не прыбавілася; ён гэтага ўжо не бачыў.. На мае столькі народу не прыдзе. Хаця —як арганізаваць... Многа залежыць ад адносін таварышоў...

Так, даволі прыгожа. Асабліва гэты момант, калі гроб плаўна апускаецца ўніз А ў падвал, да пачэй у гэта ваенца вы хадзілі глядзець? Я таксама не. Што за відовішча—не разумею. Кажуць, труп курчыцца.. Нядаўна чуў—жонку аднаго адказнага работніка нейкія дурні ўгаварылі туды заглянуць. Палюбавацца як кажуць, на мужа. Ну, канешне, прыпалак. Дурні!.. Я сваю жонку прывцыпова ні на якія хаўтуры не бяру. Гэта—не для жанчыны. Тым больш у яе бацька стары ..

Так вось. Жывеш работаеш, б'ешся, як рыба аб лёд, а пасля, калі ласка, ў скрыню, і адвозяць. Упарадку чаргі. Як кажуць: „Хто апошні, я за вамі ..." Хацеў-бы я толькі каб у мяне гэта ўсё хутка здарылася. Якое небудзь крушэнне пягніка—раз і гатова.. Гэта сястра яго жонкі. Ці не праўда, прыгожая баба? У яе муж у торгпрэдстве ці штосці іншае ў гэтым сэнсе, таму яна так апранута. Напомніце мне пасля расказаць анекдот, як да Калініна прышлі два яўрэя. Контррэволюцыйна, але вельмі смешна. Цікава, хто ўсе гэтыя анекдоты прыдумвае?.. Не, зараз нялоўка, зверэуць увагу. Лепш калі пойдзем назад...

Кажуць, у яго даўно ўжо было пашырэнне сэрца. Ён не бярогся—і вось. Я яго вельмі добра разумею. Самной тое самае здарыцца... Не, асаблівых такіх хвароб у мяне няма—але вось, напрыклад, у разгар вечара раптам пачынаюць страшэнна часаца рукі. Штосці неймавернае! Нядаўна гэта ў мяне ў тэатры пачалося—так прама на сярэдзіне хацеў пакінуць дзею. Але пасля адразу прайшло .. Урачы—ці ад іх калі небудзь дабіўся толку! Прафесар Сугаловіч кажа: старайцеся не часацца, гэта чыста нэрвовае. Што значыць чыста нэрвовае—я павінен ведаць куды гэта вядзе, чым пагражае. Мяне цікавіць не асабістае здароўе, але ж я частка чагоесці, у мяне на плячох вялікая ўстанова! Я яго пытаюся: якую дыету мне захоўваць, чаго не есці, што есці. Кажа: „Гэта не мае значэння". Усё для іх не мае значэння. Дзве недарэчныя прафесіі—урачы і эрэсісты. Павінны страхаваць ад хваробы, а карыстаюцца імі, каб мучыць нас. Добра яшчэ, што я сам захоўваю некаторы рэжым. Беручы дні адпачынка, негарачая ванна пасля работы. Пасля—вось, што я вам скажу: я прывцыпова не куру пасля ежы. Гэта вельмі важна. Думаю ў гэтым годзе як найхутчэй у адпачынак. Вы куды збіраецеся ехаць? Не, я зноў на паўдзённы бераг. Абавязкова напомніце расказаць анекдот аб трох дамах на пляжы.

Так, сумна, сумна. Галоўнае—вельмі ўжо добры мужык быў. Ніхто ад яго дрэннага не бачыў, не было ў ім, ведай це, гэтага падсіжвання, гэтага жадання нажыць на кім небудзь капітал. На яго месца? Не ведаю.. Афіпыйна не ведаю, але строга сэкрэтна магу сказаць: Свенцянскі. Ужо вырашана. Так.. я сам быў здзіўлен. Я, нават трохі пакаўся. Пазраўляў Мятнікава з новым прызначэннем. І Мятнікаў, галоўнае, не абзяргаў. Маўчаў і ўхмыляў ся... У апошнюю мінуту ўсё пераварылася. Кажуць, запатрабавалі моцнага аперацыйнага чалавека для ненаразнага практычнага кіраўніцтва. Але можна было і пры Мятнікаве мець намесніка спецыяльна па практычнай рабоце. Мятнікаў, усё ж такі фігура..

Вы што робіце паслязаўтра? Пры ходзьце абавязкова да мяне... Так нічога асабліваага, таварышы збяруцца пасядзець. Мы наваселле не наладжвалі, гэта будзе штосці накшталт поўна васелля. Было намечана на сёння—з-за хаўтур адклалі. Неяк нялоўка Хто небудзь збаўтне—скажуць: знай шлі час пянства наладжваць... Можна прыйсці і папазней. Будуць усе свае людзі. Сяргей Саламонавіч абяцаў заехаць...

Многа народу адпраўляюць у паліт адзелы. . Я-б сам з радасцю паехаў —не бяруць па хваробе. Як я паказаў ім паперку ад доктара, як яны пагляделі, нават толкам не прачыталі, за раз жа спынілі размову. Я нават пан кадаваў, што прынёс ім гэтую паперку... Бацінкі сёння мяне даканаюць! Давайце пойдзем цішэй, трохі адстанем. У мяне там ззаду ідзе машына. Адпачнем, а перад самым крэматорыем зноў бадзёра зашагаем.

Іван Вадзімавіч на лініі агня.

Таварышы, я вельмі ўважліва слухаў вашы сарэчкі. Калі гэта толькі можна назваць спрэчкамі... Слухаў—і ледзь не заснуў. Так, таварышы, ледзь—не заснуў. Я пытаюся: да чаго зноў гэтыя бязконцыя разважанні аб сыравіне, аб паліве, аб рабочай сіле, аб тарыфе. З іх, з гэтых разважанняў, ясна толькі адно. План на Лаза аўскай фабрыкі не выканан. Не выканан—вось і ўсё. Не выканан на сорак шэсць процантаў. Вось — асноўны —факт. Які сэнс гэтага факта. Тут у нас на праўленні сядзяць дарослыя людзі Я не буду, таварышы, перад вамі займацца дэмагогіяй. Не буду шумець аб тым, што рабочыя сядзяць без нашай прадукцыі... Што вясковая кааперацыя з нямым дакорам глядзіць на нас пустымі паліпамі . Што не выканан заказ для Чырвонай арміі для нашых адважных байцоў і гэтак далей..

Вы людзі дарослыя. Непатрэбна ад німаць час гэтымі агульнавядомымі рэчамі Але я скажу аб другім Сорак шэсць процантаў невыканання—вы ведаеце, што гэта значыць? Вы не чыта це газет! Вы, таварышы, зараслі цінай паўдзённых бягучых будняй. А я за палітыкай сачу. Я газеты чытаю і магу паведаміць: галаўнааббуд за 11 проц. невыканання атрымаў чатыры суровых вымовы. Адзінаццаць процантаў—а ў вас колькі?! Сцёкласі ліквата камітэт увесь распушчан за 20 проц невыканання. У саюзаканкорзбыце з суровай вымовай знят старшыня, выключан з партыі загадчык вытворчасці і яго намеснік. У рос глінафаянсе з-за трох процантаў усё праўленне засталося без чарговых ад пачынкаў! У аб'яднанні цвёрдых мета ляў адзін выключан, чацвёра зняты, двум забаронены адказныя пасады. Што? Правільна. Антон Фрыдрыхавіч мяне дапаўняе: там жа распушчана бюро ячэйкі і прызначана па-за пла навая чыстка апарата. Па-за пл навая чыстка, таварышы, па-за пла на ва-я чыст-ка. У Маслапрадуктпроме тры члена праўлення адстранёны з адда чай пад суд, нам. старшыні знят, старшыня зволен увіду перахода на іншую работу... Ды што Маслапром! Цэлыя наркаматы атрымліваюць па мордзе—пачытайце газеты Што-ж вы думаеце—з намі пакацца будуць? Цацкацца не будуць! Не будуць і што ж нам тут прапануюць? Зняць нашага ўпаўнаважанага на заводзе? Дабіцца большай адгрузкі сыравіны? Узмацніць прэміяванне? Прызначыць новага дырэктара? Завесці чырвоную і чорную дошкі? Наіўна, таварышы, смешна! Бязконца смешна і наіўна. За чым зачыняць вочы? Нехай хто не будзь з прысутных паручыцца, што фабрыка вылезе хоць на палову да канца квартала. Ніхто такога паручы цельства з нас даць не можа. Становішча цяжкае. Усякія поўмеры былі-б бліварукасцю, двойчы небяспечнай... Трэба дзейнічаць рашуча, смела і пры гэтым дальнавідна.

Што-ж я прапаную? Лазараўскую фабрыку мы пераўтвараем, пераіменоўваем, ну, словам, пераўтвараем у камбінат і, калі хочаце, у трэст. Што? Чаму-ж! Бываюць на мясцох і яшчэ меншыя трэсты. Пераўтвараем у трэст абласнога значэння. Ольга Максімоўна, пашукайце ў архіву, там дзесці павінна быць паперка ад Іваноўскага абкома. Здаецца пачатак мінулага года. Яны прасілі тады перад-ць Лазараўку ў веданне вобласці. Тады мы катэгарычна адмовілі. А зараз—зараз мы катэгарычна згадзіліся. Што? Я вас не перабіваў, выслухайце цярпліва і вы свайго старшыню і таксама не перабівайце... Пераўтвараем у абласны трэст. Адзываем зараз жа ўпаўнаважанага—каб не шкодзіць мясцовай арганізацыі кіраваць. Прадастаўляем абкому пасадзіць новага дырэктара ці па кінуць былога. Гэта іх справа, вы хай яны адказваюць! А галоўнае—без адкладна выводзім Лазараўку з ваша га цэнтралізаванага прамфінплана... І гэтым, як не трудна здагадацца ад разу змяншаем процант нашага выканання!..

Аддзяліць хворае ад здаровага—вось сэнс мерапрыемства! Няхай здаровы адказвае за здаровае, а хворы за хворае! Адсякаем гнілую частку арганізма і даём ёй магчымасць альбо памерці, альбо выздаравець ва ўмовах свае часовай ізаляцыі... Няхай абком кіруе фабрыкай, няхай напраўляе яе ўсімі маючымися ў яго метадамі ўздзейнічання. Няхай выключае людзей з партыі, няхай хоць рэжа на кавалачкі. А мы тут прычым?! Фабрыка-ж не ў Маскве... Зрабіць трэба зараз, безадкладна, мгнавенна. Правяць максімальную аперацыйнасць. Да канца квартала засталося пяць тыдняў. Няхай, калі пачнуць глядзець квартальныя вынікі—няхай тады мы будзем ужо даўно ў старонцы... Што? Не хітра, а мудра дарагія таварышы! Мазгі трэба мець! Маз-гі. Кацялок пазнен варыць на плячах. Без кацялка мы ўжо даўно з вамі прапалі-б.

Іван Вадзімавіч кахае літаратуру

— Шолахаў? Канешне, чытаў. Не ўсё, але чытаў. Што менавіта—не памятаю, але чытаў. „Ціхі Дон"—ці ж гэта яго? Як-жа, чытаў. Па сутнасці праглядаў. Пераліставаў... Часу, ведаеце, не хапае чытаць кожны радок. Ды па мойму і не трэба. Асабіста я магу толькі зірнуць на старонку і ўжо схопліваю асноўны сэнс. У мяне гэта ад чытання дакладных запісак выпрацавалася... Але наогул—да чаго ўсё-ткі слаба пішуць! Няма, ведаеце, задора, няма глыбіні... Не разумею, у чым тут справа. Але-ж, у якія ўмовы іх ставяць, каб вы толькі ведалі! Ганарары, пуцёўкі, мастацкія водпускі, каманды роўкі. Пры гэтым ніякай адказнасці, ніякага прамфінплана. Калі-б мяне хоць на паўгода так устроілі—чаго-б я толькі не панапісаў! Даныя? Што значыць даныя! Калі цябе партыя паставіла на вызначаны

ЛЕЙПЦЫГСКАЯ ІНСЦЭНІРОЎКА Ў БЕРЛІНЕ.

Допыт Гебельса.

БЕРЛІН, 8. У судзе па справе аб падпале рэйхстага выступіў з паказаннямі германскі міністр прапаганды ГЕБЕЛЬС. У звязку з гэтым ахова будынка рэйхстага была ўзмоцнена.

Хаця тэрмін выключэння Дзімітрава з пасяджэнняў яшчэ не скончыўся, ён усё ж прысутнічае.

У адзнаку ад Герынга, Гебельс лічыць за лепшае не давать агульнай характарыстыкі становішча і фактаў, а адказваць на пытанні.

Старшыня запытвае Гебельса адносна сцвярджэння, што 27 лютага ні адзін з міністраў не выступаў на прадвыбарчых сходах. Гебельс тлумачыць гэта „выпадковым супадзеннем", а таксама і тым, што ў гэты дзень раніцою адбывалася пасяджэнне габінета. На далейшыя пытанні старшыні Гебельс адказвае, што вечарам 27 лютага Гітлер быў у яго ў гасцях, калі яму—Гебельсу—паведамілі па тэлефону аб пажары рэйхстага. Ён спачатку „прыняў гэта як жарты". Толькі пасля паўторнага тэлефоннага званка Гебельс паведаміў аб здарыўшымся Гітлеру і разам з ім адправіўся на месца пажара, праз поўгадзіны пасля атрымання паведамлення.

Спатканы імі там Герынг заявіў, што гутарка ідзе аб таварыстычным акце буйнага палітычнага значэння. Па словах Гебельса, урад быў адзіна душны ў пытанні аб тым, што „пад пал з'яўляецца справай рук камуністаў" і што „шляхам падпала рэйхстага комуністычная партыя спрабавала выклікаць усеагульныя непаладкі і скарыстаць іх у сваіх метах". «Калі-б замах удаўся,—сказаў Гебельс—яго арганізатары былі-б абвешчаны героямі».

Па словах Гебельса, у рэйхстагу пасля прыбыцця туды членаў габінета адбылася невялікая нарада, на якой абгаварвалася пытанне аб забароне комуністычнай партыі, комуністычнага друку, а потым і соцыял-дэмакратычнга друку.

Далей Гебельс заяўляе, што, хаця комуністычная партыя і выступіла супроць індывідуальнага тэрору, але гэта, па яго словах, „не мела практычнага значэння".

На пытанне пракурора Гебельс адказвае, што сцвярджэнне „Карычневай кнігі" аб тым, што перспектывы выбраў былі ў той момант неспрыяльныя для нацыянал-соцыялістаў—няверна. Старшыня БЮНГЕР канстатуе, што правадыр компартыі ТЭЛЬМАН заявіў, што компартыя адкрывае лозунг „Бей фашыстаў, дзе іх спаткаеш" і запытвае Гебельса, ці зрабіла компартыя ўсё неабходнае для таго, каб практычна правесці ў жыццё свой пункт гледжання. На гэта Гебельс адказвае, што «компартыя ў сваім нелегальным друку прама заклікала да гвалтоўных актаў». З лавы падсудных падымаецца ДЗІМІТРАЎ. У залі рух. Дзімітраў запытвае Гебельса аб радыёпрамове, у якой ён сцвярджаў, што ў падпале рэйхстага вінаваты не толькі компартыя, але і соцыял-дэмакраты.

ГЕБЕЛЬС: „Гэта вельмі магчыма, так як мы, нацыянал-соцыялісты, лічым, што няма глыбокай розніцы паміж комуністычнай партыяй і соцыял-дэмакратыяй. Розніца гэта толькі ў тактыцы".

ДЗІМІТРАЎ: „Гебельс заявіў, што па перакананні ўсяго габінета, падпал рэйхстага павінен быў быць сігналам да ўзброенага паўстання. Я хацеў-бы ведаць ці былі прыняты габінетам 26—27 лютага ці ў бліжэйшыя пасля пажара рэйхстага дні рашэнні аб мабілізацыі ўзброеных сіл і якія меры былі прыняты супроць чакаемага паўстання. Ці існуе такое рашэнне габінета ці не"?

ГЕБЕЛЬС: „Практычная барацьба супроць комуністычнай небяспекі з'яўляецца толькі задачай паліцыі, якая па вінна была весці практычную барацьбу з комуністычнай партыяй пад сваёй адказнасцю".

СТАРШЫНЯ: „Сведка не абавязан даваць паказанні адносна іншых ведамстваў".

ДЗІМІТРАЎ: «Я думаю, што па гэтым пытанні вельмі важны імёны паказанні Гебельса, як кіраўніка міністэрства прапаганды. Сведка, відавочна, ведае, што пажар рэйхстага быў скарыстан урадам і асабліва міністэрствам прапаганды для прыдушэння прадвыбарчай агітацыі компартыі, соцыял-дэмакратыі і іншых партый".

ГЕБЕЛЬС: «У гэтых адносінах не былі прыняты якія небудзь асаблівыя меры, бо падпал рэйхстага быў толькі падцвярджэннем нашых магчымасцяў аб неабходнасці барацьбы супроць комуністаў".

ДЗІМІТРАЎ: „Ці вядома сведцы, што ў Германіі адбывалася многа палітычных забойстваў, як былі забіты комуністычныя правадыры Карл Лібкнехт і Роза Люксембург?".

Старшыня, спыняючы Дзімітрава, гаворыць, што гэта пытанне не мае адносін да падпала рэйхстага.

ДЗІМІТРАЎ: «Ці вядома сведцы, што забіты былі таксама Ратэнаў і Эрцбергер?».

Старшыня зноў спыняе Дзімітрава.

Гебельс адказвае, што нацыянал-соцыялісты не мелі ніякіх адносін да гэтых забойстваў.

ДЗІМІТРАЎ: «Ці не было такіх выпадкаў, калі нацыянал-соцыялісты рабілі тэрарыстычныя акты, ці не было працэсаў па падобных справах, ці не пасылалі прыхільнікі ўрада па такому поваду тэлеграм нацыянал-соцыялісткаму кіраўніцтву?».

ГЕБЕЛЬС: «Нацыянал-соцыялісцкі рух змагаўся супроць такога роду тэндэнцый. Калі Гітлер паклаў прывітанне нацыянал соцыялісцкім штурмавікам, абвінавачваўшымся ў забойстве рабочых-комуністаў (да прыхода Гітлера да ўлады), то ён зрабіў гэта таму, што лічыў, што яны дзейнічалі не з карысных пабуджэнняў».

Пракурор заяўляе, што пытанні Дзімітрава павінны быць адхілены, так як „яны пастаўлены ў мэтах агітацыі". На гэта Дзімітраў заяўляе, што яго пытанні звязаны з абвінавачаннем, высоўваемым супроць седзячых на лаве падсудных. Гебельс згаджаецца адказаць на пытанні Дзімітрава, каб «не даць магчымасці Дзімітраву і сусветнаму друку сцвярджаць, што ён ухіляецца ад адказа».

ДЗІМІТРАЎ: «Ці быў такі перыод, калі нацыянал соцыялісты вялі нелегальную дзейнасць—у той час, калі гэта партыя была забаронена?».

ГЕБЕЛЬС: «Іменна ў нацыянал-соцыялістаў справа ішла толькі аб абароне законаў і дзяржавы».

ДЗІМІТРАЎ: „Ці не ішла гутарка аб змене канстытуцыі?"

ГЕБЕЛЬС: «Мы змагаліся толькі супроць таго, каб комуністычная партыя змяніла канстытуцыю».

ДЗІМІТРАЎ: «Ці не была гэта канстытуцыя зменена ўжо раней да прыхода нацыянал - соцыялістаў да ўлады?»

ГЕБЕЛЬС: „Мерапрыемствы, якія тады былі праведзены, былі прыняты парламентам на аснове канстытуцыі. Нацыянал-соцыялісты хацелі змяніць яе больш грунтоўна".

ДЗІМІТРАЎ:—«Мы хочам змяніць канстытуцыю яшчэ больш грунтоўна».

Дзімітраў запытвае Гебельса: „Вы сцвярджалі, што нацыянал-соцыялісты падвяргаліся нападам. Я запытваю, ці абараняліся нацыянал-соцыялісты?»

ГЕБЕЛЬС: «Само сабой зразумела, абараняліся».

Дзімітраў голасна запытвае: „Ці думаеце вы пэпер, што комуністы, якія падвяргаюцца праследванням, маюць права абараняцца?"

Старшыня пагражае Дзімітраву выключэннем з пасяджэння і прымушае яго замаўчаць.

У заключэнне Гебельс заяўляе, што ён імкнуўся абвергнуць абвінавачанні «Карычневай кнігі», высунутыя супроць германскага ўрада.

* * *

Далей суд пераходзіць да допыта афіцыянтаў рэстарана Байернгоф. Афіцыянт Эльмерт заяўляе, што ён бачыў балгар разам з Ван-дэр-Любе. Аднак, паказанні сямі іншых афіцыянтаў і аднаго служачага рэстарана поўнасцю абвяргаюць паказанні Эльмерта. Паказанні Эльмерта былі вялікім пунктам абвінавачання адносна сувязі падсудных балгар з Ван дэр Любе. Абвяржэнне гэтых паказанняў аказалася абойственным для абвінавачання. У адказ на пытанне старшыні, сведкі рашуча і катэгарычна заяўляюць, што яны не бачылі Ван дэр-Любе ў сваім рэстаране і ніколі не бачылі яго з балгарамі.

ПЕРАГАВОРЫ ПАМІЖ тав. ЛІТВІНАВЫМ І ХЭЛЛАМ.

ВАШЫНГТОН, 10. Па маючыхся звестках, адбываўшыяся 9 раніцою перагаворы Літвінава з Хэллам у агуле працякалі гладка.

Хэлл заявіў прадстаўнікам друку, што перагаворы з Літвінавым прасоўваюцца. Многія пытанні будуць абгаворваны. Наступнае паведамленне магчыма „асветліць" становішча.

Гутарка Рузвельта з Літвінавым адбудзецца ў поўдзень 10 лістапада. У апублікаванай міністэрствам замежных спраў праграме нарад указвалася: «9 ці 10 лістапада пасля таго, як прэзідэнт будзе інфармаван дзяржаўным сакратаром, што перагаворы паміж імі і Літвінавым значна прасунуліся, прэзідэнт прыме Літвінава для гутаркі з ім».

9 лістапада Хэлл наладзіў снеданне ў гонар Літвінава.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС.

Японская і манчжурская прэса друкуе, як буйную „сенсацыю" паведамлення агенцтваў „Сімбун Рэнго" і „Дэмпо Цусін" аб тым, што ў вёсцы Пятроўскім, каля Благавешчанска, нібы-та ў пачатку кастрычніка „забіта Чырвонай арміяй 200 манчжурскіх грамадзян за няўзнос хлебнага падатка". Бязглуздзнасць гэтай правакацыйнай выдумкі сведчыць ужо з таго, што ні ў вёсцы Пятроўскім, ні ў іншых вёсках у раёне Благавешчанска „манчжурскія грамадзяне" наогул не пражываюць сотнямі ці нават дзесяткамі, а толькі выпадковымі адзінкамі. ТАСС упаўнаважан заявіць, што „сенсацыйныя" паведамленні агенцтваў „Сімбун Рэнго" і „Дэмпо Цусін" з'яўляюцца ад пачатка да канца паклёпніцкай выдумкай іх аўтараў.

Совецкая дэлегацыя выехала з Турцыі у СССР.

СТАМБУЛ, 10. 10 лістапада совецкая дэлегацыя на чале з Варашылавым выехала з Стамбула ў Адэсу. Дэлегацыю праваджалі прадстаўнікі турецкіх улад.

АНКАРА, 9. Паводле паведамлення анатолійскага агенцтва, у дзень адъезда совецкай дэлегацыі з Турцыі старшыня совета міністраў ІСМЕТ-ПАША апублікаваў заяву, у якой гаворыцца: „За час свайго знаходжання ў Анкары совецкая дэлегацыя была некалькі раз прынята прэзідэнтам рэспублікі, які меў з нашымі сябрамі афіцыйныя і неафіцыйныя гутаркі, у якіх яны абгаварылі ўсе цікавячыя іх пытанні. Усе гэтыя гутаркі выразна паказалі, што турэцка-совецкае сяброўства зараз больш моцна, чым калі-б там ні было і што яму суджана развівацца і ў будучым для агульнага блага, для справы міра, у інтарэсах яко а цесная супрацоўніцтва абодвух краін. У момант, калі совецкая дэлегацыя пакідае Турцыю, я лічу неабходным яшчэ раз даць уряду сяброўскай краіны і ўсім тым, каго мы з такой радасцю прымалі тут, самыя сяброўскія заверэні ад імя ўрада Турэцкай рэспублікі. У нас застануцца незабыўныя ўспаміны аб іх знаходжанні ў нашай краіне".

МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА СПРАВАХ ДРУКУ.

Выступленне совецкага дэлегата.

ПАРЫЖ, 10 У МАДРЫДЗЕ адкрылася другая міжнародная канферэнцыя прадстаўнікоў урадаў па справах друку. Рэд дэлегатаў абгаварыў вострыя пытанні і абмежаваўся агульнымі пажаданнямі. На гэтым фоне рэзка вылучылася прамова совецкага дэлегата РОЗЕНБЕРГА, прысвечаная барацьбе з пагрозай вайны і з хлуслівымі паведамленнямі.

Тав. Розенберг напомніў буйную ролю друка ў падрыхтоўцы інтэрвенцыі супроць Совецкага саюза і падкрэсліў, што бязглузныя выдумкі аб СССР і цяпер пашыраюцца поўнай часткай друку для падрыхтоўкі грамадскай думкі да ўзброенай барацьбы з Совецкім саюзам.

Асвятліўшы ролю совецкага друку ў барацьбе за мір, Розенберг указаў, што выдаючыяся на розных мовах з тыражом 30 млн., совецкія газеты ніколі не заклікалі да нападу на іншыя краіны, а наадварот, усюды прапагандавалі ідэю міра.

Канферэнцыя павінна весці барацьбу з хлуслівай інфармацыяй, пагражаючай міру і міжнароднаму супрацоўніцтву. «Рэзалюцыі папярэдняй капенгагенскай канферэнцыі,—заявіў Розенберг,—не далі ў гэтых адносінах ніякага эфекту. Рэзалюцыі гэтай канферэнцыі таксама застануцца мёртвай літарай, калі яны не дадуць поўнага азначэння ложнай інфармацыі ў адносінах цэнтральных праблемы захавання міра». У заключэнне Розенберг падкрэсліў, што асаблівая адказнасць падае на афіцыйныя агенцтвы і газеты, якія маглі-б адыграць буйную ролю ў барацьбе з ілжывай інфармацыяй.

Грамадзянская вайна на Кубе.

НЮ ЮРК, 8. Па паведамленні з Гаваны (Куба), частка арміі, паліцыі і паветранага флота паўстала супроць урада Марціна, дамагаючыся зварота да ўлады былога прэзідэнта Сеспедэса. У вулічных баях забіта больш 30 чал., 100 чал. паранена. У руках паўстаўшых частка горада Гаваны. Баі працягваюцца.

Забастоўка шофераў таксі ў Грэцыі.

АФІНЫ, 10. 9 лістапада па ўсёй Грэцыі забаставалі шоферы таксі. У АФІНАХ да руху далучыліся рабочыя аўтобусаў. Афінская паліцыя зрабіла вобыск у прафсаюзе шофераў і арыштавала стачачны камітэт. Кіраўніцтва рухам перайшла ў рукі нелегальнага стачачнага камітэта.

Адстаўка румынскага ўрада.

ВЕНА, 10. Працягны крызіс румынскага ўрада Вайды-Войводы скончыўся падзеннем габінета. Прычына ўходу ўрада ў адстаўку—абвастрэнне знешніх і ўнутраных супярэчнасцяў на фоне банкрутства эканамічнай палітыкі ўрада.

ЭКВАДОР УСТАНАЎЛЯЕ НАРМАЛЬНЫЯ ДЫПЛОМАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ З СОВЕЦКІМ САЮЗАМ.

НЮ-ЮРК, 10. Парламент Эквадора пераважнай большасцю адобрыў пранапанову міністэрства замежных спраў устанавіць нармальныя дыпломатычныя адносіны з Совецкім саюзам.

Не паддавацца „галавакружэнню" ад поспехаў, замацаваць дасягненні.

(На урачыстым вечары рабочых алейнага завода).

Першая пяцігодка ў сваю гісторыю запісала 518 нова-пабудаваных у Совецкім саюзе фабрык і заводаў, у ліку якіх увачоў і Віцебскі алейны завод, абсталяваны па апошняму слову тэхнікі—лепшымі варштатамі і машынамі алейнай прамысловасці.

Святкуючы вялікую гадавіну Кастрычніка, калектыў рабочых завода адрычнікаў, як узяўшы ў аснову сваёй значыў, як узяўшы ў аснову сваёй работы лепшыя метады працы—соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, яны вывелі па якасці выпускаемай прадукцыі завод на першае месца ў алейнай прамысловасці Совецкага саюза—замест запраектаванай алейнасці жмыхоў у 7 проц., дабіліся гаснасці жмыхоў у 7 проц., дабіліся гаснасці жмыхоў у 7 проц., дабіліся гасн